№ 46 (644) 9 снежня 2009

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**На што перасадзяць беларусаў? Машыны расійскай зборкі**

Старонка 8




**А ў вас ёсць «Параноя»?**

Старонка 10



**Вольскі запісаў альбом класікі**

Старонка 11


**У НУМАРЫ**

**Экс-дырэктару Дэпартамента фінансавых расследаванняў прад'яўленае абвінавачанне**

Анатоля Грамовіча вінавацяць у стварэнні буйной злачыннай арганізацыі. **Старонка 6.**

**«Войска зрабіла мяне самастойным»**

Гутарка з Іванам Шылам. **Старонка 7.**

**Дзе ўсё ж адбывалася каранацыя Міндоўга?**

Піша Алег Дзярновіч. **Старонка 12.**

**Галубцы, свіныя ножкі і — ох! — рулька**

Піша Наталка Бабіна. **Старонка 13.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Эскадроны страху

Хто выкрадае людзей у Беларусі? **Старонка 5.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Таварыш Жукаў, вас яшчэ не расстралялі?

Праляскоўскі — міністр інфармацыі, Мальцаў — на Радзе бяспекі, асуджаны і памілаваны Бароўскі — дырэктарам МАЗа.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Прызначэнне генерала Мальцава — знак увагі войску.**

## Двайная гульня Анатоля Ляўковіча

У рэдакцыю «НН» трапіў ліст старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі Анатоля Ляўковіча да лідэра «Справядлівай Расіі» Сяргея Міронава.

Гэты ліст датуецца 8 кастрычніка 2008 году, набраны на афіцыйным бланку сацдэкаў. Назва — «О новых возможностях развития интеграционных процессов».

У сваім звароце Ляўковіч пазіцыянуе сябе большым прыхільнікам інтэграцыі з Расіяй за Лукашэнку.

«У апошнія гады становіцца ўсё больш відавочным, што кіраўніцтва РБ адхіляецца ад інтэграцыйнай стратэгіі. Інтэграцыйныя працэсы тармозяцца. Краіна практычна закрытая для поўнамаштабных інвестыцый расійскага капіталу. Гэта — ненармальная практыка ў саюзніцкіх адносінах і яўны сігнал пра негатыўную перспектыву іх развіцця», — зазначае Ляўковіч.

Сустаршыня АДС папярэджвае расійскага партнёра аб «умацаванні напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў празаходняга крыла апазіцыі». «Усё гэта крок за крокам памяняе грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне не на карысць развіцця беларуска-расійскай інтэграцыі», — са скрухай зазначае сацыял-дэмакрат. Ляўковіч прапануе «шукаць новыя магчымасці для папярэджання і супрацьстаяння такому негатыўнаму развіццю падзей».«Выбудоўванне саюзніцкіх адносінаў на ўзроўні кіраўніцтва нашых краін — важнае, але, як паказвае практыка, недастатковае. Неабходна мэтанакіравана і па магчымасці сістэматычна фарміраваць і ствараць больш шырокія ўмовы для ўключэння ў інтэграцыйныя працэсы грамадскасці», — працягвае Ляўковіч. І выступае з канкрэтнай ініцыятывай, якая дапаможа ўмацаваць саюз: «Значным інструментам для развіцця саюзніцкіх адносін магла б стаць грамадская палата народных прадстаўніцтваў, якую ёсць сэнс стварыць у Беларусі».

У Расіі грамадская палата была створаная ў 2005 годзе. Сяброў палаты зацвярджае асабіста прэзідэнт Расіі. У склад палаты ўваходзяць палітыкі, акцёры, палітолагі, святары, медыкі, навукоўцы, праваабаронцы.

**Працяг на старонцы 3.**

# Трагедыі, якія сталі заканамернасцю

Пажар у начным клубе ў Пермі — чарговы ў ланцужку здарэнняў у Расіі.

У пятнічны вечар 5 снежня ў начным клубе «Кульгавы конь» у горадзе Перм (Расія) адзначался 8-годдзе забаўляльнай установы. На карпаратыў былі запрошаныя 300 чалавек. Паводле папярэдніх звестак, прычынай пажару стаў феерверк. 117 чалавек, пераважна жанчыны, памерлі ў выніку цісканіны і атручвання чадам, больш за сотню трапілі ў бальніцы.

7 снежня ў Расіі быў абвешчаны жалобным днём.

Здарэнне выклікала гнеў у Крамлі. Ужо на наступны дзень былі заведзеныя крымінальныя справы супраць адміністрацыі клуба і кіраўніка піратэхнічнай кампаніі «Пироцвет», што рабіла феерверк. Затрыманым пагражае ад 5 да 7 гадоў турмы.

Але што махаць кулакамі пасля бойкі — піратэхнічныя шоу ў клубе былі забароненыя, аднак адказныя за кантроль чыноўнікі заплюшчвалі на гэта вочы: фаер-шоу ў «Кульгавым кані» адкрыта рэкламаваліся ў СМІ і грамадскім транспарце. Дый фірма «Пироцвет» ужо мае ў біяграфіі крымінальную справу: іх феерверк у горадзе Бярэзнікі Пермскага краю ў 2005 г. скончыўся трагедыяй — аскепак снарада цяжка параніў дзіця.

«Трагедыя ў пермскім начным клубе стала чарговым сведчаннем таго, што Расія — краіна трэцяга свету. У яе настолькі запушчаная інфраструктура і татальна карумпаванае чынавенства, што такія надзвычайныя здарэнні з'яўляюцца заканамернасцю, а не трагічным збегам абставін», — піша «Газета.ру». Нагадаем, за тыдзень да гэтай трагедыі пацярпеў крушэнне цягнік «Неўскі экспрэс», што кіраваўся з Масквы ў Санкт-Пецярбург.

**Сямён Печанко**




**7 снежня кампанія «Будзьма» адзначыла сваю гадавіну. Кампанія займаецца папулярызацыяй усяго беларускага. На фота: спявак Зміцер Вайцюшкевіч і матор кампаніі «Будзьма» Алена Макоўская. Трыумф Вайцюшкевіча на «Зорным рынгу» — старонка 6.**

# 6 700 шпіталізаваных з пнеўманіяй у Гомельскай вобласці

З канца кастрычніка да пачатку снежня, у перыяд эпідэмічнага ўздыму захворвання на грып і ВРІ, па меддапамогу звярнуліся 191 659 жыхароў Гомельшчыны. Што ў 4,8 разу больш, чым за аналагічны леташні перыяд. Шпіталізавана 6460 чалавек з ВРІ і 6678 чалавек з пнеўманіяй.

Уздым захворвання на ВРІ ў Гомельскай вобласці сёлета пачаўся 29 кастрычніка — 4 лістапада. Ён рэгістраваўся ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, найбольшы ўзровень захворвання з пачатку сезона адзначаны ў Мінскай (16 560 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва) і Гомельскай (16 365 на 100 тысяч насельніцтва) абласцях, найменшы — у Гродзенскай (10 886 на 100 тысяч насельніцтва) і Брэсцкай (10 942 на 100 тысяч насельніцтва).

**БелаПАН**

## СЦІСЛА

### Справу Асіпенкі-Аўтуховіча працягнулі

Расследаванне працягнулі да 8 студзеня 2010 г., каб абвінавачаныя знаёміліся з матэрыяламі. Справа складаецца з 17 тамоў. Аўтуховіча і Асіпенку вінавацяць у падрыхтоўцы тэракту супраць высокапастаўленых чыноўнікаў і нанясенні шкоды маёмасці міліцыянта ды інспектара падатковай службы. Абвінавачаныя тлумачаць пераслед помстай за антыкарупцыйную дзейнасць.

### Бралі аўто напракат і прадавалі

Два хлапцы з Мінска (20 і 22 гады) узялі напракат «Аўдзі» на суткі, прадалі перакупшчыкам за $2,5 тыс., часткай грошай аплацілі арэнду машыны на месяц наперад, а астатнія прасадзілі ў барах і клубах. Пры гэтым кожны ўзяў напракат яшчэ па машыне. Вырашылі паўтарыць афёру, але забыліся ў бардачку аўто дамову аб арэндзе... Заведзена крымінальная справа па ч.4 арт.209 КК, якая прадугледжвае да дзесяці гадоў пазбаўлення волі.

### Крыж Лапіцкага зноў збурылі

На месцы расстрэлу героя антысавецкага супраціву Расціслава Лапіцкага спілаваны мемарыяльны крыж. Саветы расстралялі Лапіцкага ў 1950 годзе каля Вілейкі ва ўрочышчы Красны Беражок. Крыж быў выраблены з добрага дрэва. Каля памятнага знака ляжалі кветкі і гарэлі лампады.

**НШ, БелаПАН, БЕЛТА**


# Пара аформіць падпіску

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае **6000 рублёў**.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — **63125**, для прадпрыемстваў — **631252**. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 — Асабовы рахунак

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,**

дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**


# Дзякуй падпісчыкам

Віталю Б., А.А., Валерыю К. з Полацка.
С.С. з Любанскага раёна.
Вользе П., А.А. з Магілёва.
Аляксандру С. з Карэліцкага раёна.
Міхаілу Т. са Слуцкага раёна.
Дзмітру К. з Рагачоўскага раёна.
Вікенцію С. з Валожынскага раёна.
Л.П., Дзмітру П., Уладзіміру С., Дзянісу К., Т.Т., Валерыю Г. з Гомеля.
Мікалаю Р. з Навагрудскага раёна.
Анатолю С. з Маладзечанскага раёна.
В.Б. з Светлагорскага раёна.
Андрэю Л., Наталлі Т. з Салігорскага раёна.
Пятру К. з Мастоўскага раёна.
Аляксандру Б. з Капыльскага раёна.
Мікалаю С. з Ганцавіцкага раёна.
М.Б., В.В., Генадзю К. з Гродна.

# Таварыш Жукаў, вас яшчэ не расстралялі?

**Праляскоўскі — міністр інфармацыі, Мальцаў — на Радзе бяспекі, асуджаны і памілаваны Бароўскі — дырэктарам МАЗу.**

### Выплыў

Уладзіміра Русакевіча на пасадзе міністра інфармацыі замяніў непатапляльны Алег Праляскоўскі. У свой час ён працаваў у Адміністрацыі прэзідэнта, быў галоўным ідэолагам краіны, а пасля яго адсунулі ў дырэктары Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі.

З пасады кіраўніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Праляскоўскі сыходзіў са скандалам. За хабарніцтва ў турме аказаўся непасрэдны падначалены і намеснік Праляскоўскага, Уладзімір Холад. Хадзіла шмат размоваў, што следам можа адправіцца і ягоны шэф.

Не: Праляскоўскага адправілі ўдзельнічаць у стварэнні «Белай Русі». Напэўна, добра сябе зарэкамендаваў: зноў заўважылі наверсе.

Нічога добрага незалежным СМІ чакаць ад прызначэння Праляскоўскага не выпадае. Нагадаем толькі, што ў кастрычніку 2007 году гэты чалавек засудзіў «Народную волю» і яе журналістку Марыну Коктыш на 27 мільёнаў рублёў.

Для беларускай культуры Праляскоўскі таксама чалавек чужы. Менавіта з ягонай лёгкай рукі з падручнікаў па беларускай літаратуры былі выкінутыя творы Быкава, Арлова, Барадуліна, Гілевіча, «Тутэйшыя» Купалы. «Мінімізаваць выкарыстанне твораў апазіцыйна настроеных пісьменнікаў», — прапанаваў Праляскоўскі.

Прызначэнне Алега Праляскоўскага на пасаду міністра інфармацыі можа азначаць падрыхтоўку атакі на незалежныя СМІ. 4 снежня Лукашэнка зрабіў шэраг кадравых прызначэнняў.

### Мальцава — на Жадобіна, Жадобіна — на Мальцава

Нечаканай выглядае ракіроўка Юрыя Жадобіна і Леаніда Мальцава. Першы стаў новым міністрам абароны замест Мальцава, а другі — старшынём Рады бяспекі замест Жадобіна. Лукашэнка не першы раз так тасуе чыноўнікаў. Зімой 2008 году пасадамі памяняліся



Алег Праляскоўскі.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ



Бароўскі: з турмы — у дырэктары.

генпракурор Міклашэвіч і старшыня Канстытуцыйнага суду Васілевіч.

Жадобін пратрымаўся на пасадзе кіраўніка Рады бяспекі паўтара года. Яго прызначылі пасля скандальнай адстаўкі Віктара Шэймана. Да гэтага ўраджэнец Днепрапятроўска Жадобін узначальваў КДБ, а яшчэ раней — службу аховы Лукашэнкі.

На няпрофільнай для сябе пасадзе ў Камітэце дзяржбяспекі Жадобін запомніўся заявамі пра 1767 дэструктыўных элементаў. «Чэкісты» пад яго загадам узмацнілі вярбоўку апазіцыйнай моладзі.

Імя Жадобіна называлі сярод людзей з каманды Уладзіміра Макея і Віктара Лукашэнкі. Тым не менш, яшчэ летам Лукашэнка-старэйшы пачаў выказваць незадаволенасць працай кіраўніка Рады бяспекі. «Вы жорстка прайграяце папярэднім дзяржсакратарам. Я ўжо даўно за гэтым назіраю», — сказаў кіраўнік Беларусі Жадобіну на адной з нарад.

Для танкіста Жадобіна праца міністра абароны не павінна быць складанай, усё ж па спецыяльнасці. Але гэта відавочнае паніжэнне.

Леанід Мальцаў найбольш з усіх міністраў знаходзіўся на пасадзе — аж з сакавіка 2001 года. Мальцаў зарэкамендаваў сябе як чалавек, які не ўмешваецца ў «разборкі» груповак ва ўладзе. Ён заўсёды заставаўся падкрэслена нейтральным.

За Мальцавым беларускае войска пачало пазбаўляцца савецкай спадчыны. Больш строгай стала адказнасць за «дзедаўшчыну», палепшыліся ўмовы праходжання службы.

Тым не менш, пенсійны ўзрост Мальцава можа сведчыць, што ягоная фігура на пасадзе кіраўніка Рады бяспекі будзе часовай.

### Корбут, ды не той

Мікалай Корбут стаў новым кіраўніком справаў прэзідэнта, ён замяніў Уладзіміра Дамашкевіча. Гэта не той Мікалай Корбут, які працаваў міністрам фінансаў, пакуль яго не разбіў інсульт. Той Мікалай Пятровіч, а гэты Мікалай Мікалаевіч.

У Корбута досыць цікавая службовая біяграфія. У вышэйшых эшалонах улады ён ад 1994 года, але за гэты час займаў толькі дзве пасады: ад 1994 да 2001 года быў начальнікам управы па абслугоўванні дыпламатычнага корпуса і афіцыйных дэлегацый «Дыпсервіс» кіраўніцтва справаў прэзідэнта. А ад 2001 года стаў намеснікам кіраўніка справаў прэзідэнта. Чалавек правераны.

### Малады міністр эканомікі

Былы міністр эканомікі Мікалай Зайчанка сыходзіць на заслужаную пенсію. На сваёй пасадзе ён верай і праўдай адслужыў пэўць гадоў.

Пераемнікам Зайчанкі стаў Мікалай Снапкоў — адзін з наймаладзейшых у атачэнні Лукашэнкі (40 гадоў). Снапкова ў Мінску заўважылі пасля мінулых парламенцкіх выбараў. Тады намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама ўзнялі аж да намесніка кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта. Фантастычны кар'ерны ўзлёт для 39-гадовага чыноўніка.

У Снапкова ідэальная біяграфія сярэдняга беларускага ўрадоўца. Ён скончыў Горацкую сельгасакадэмію. Працаваў у Хоцімскім, Горацкім, Мсціслаўскім, Дрыбінскім раёнах. Потым яго павысілі да Магілёва, яшчэ пазней да Мінска.

Працуючы ў Адміністрацыі, гэты чалавек звярнуў на сябе ўвагу тым, што смела падбіраў сабе кадры з ліку маладых эканамістаў, што атрымалі ці павысілі адукацыю ў недзяржаўных установах.

### Ва ўрадзе мусіць быць жанчына

Нарэшце запоўнілася вакантнае месца міністра працы і сацыяльнай абароны, якое пуставала ад чэрвеня, калі на павышэнне ў віцэ-прэм'еры пайшоў Уладзімір Патупчык. Новым міністрам стала Марыяна Шчоткіна.

Яна доўгі час працавала намеснікам міністра, а яшчэ раней была дырэктаркай адной з мінскіх школ, а таксама кіраўніцай аддзела адукацыі Фрунзенскага раёна сталіцы.

Напэўна, так трэба, каб ва ўрадзе была стабільна адна жанчына-міністр. Вось з'явілася спадарыня Шчоткіна, затое пасады пазбавілася міністр па падатках і зборах Ганна Дзейка.

Нараканняў да працы Дзейкі не было, але ў беларускіх рэаліях не прынята, каб чалавек займаў сваю пасаду вельмі доўга. Адпрацавала Дзейка пяць гадоў — саступі месца намесніку Уладзіміру Палуяну.

Зняты з пасады дуаен Мікалай Азаматаў. 71-гадовы чыноўнік больш не старшыня Ваенна-прамысловага камітэта. Ягонае месца заняў вайсковец Сяргей Гурулёў.

### Вяртанне Бароўскага

Кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей 7 снежня прадставіў працоўнаму калектыву ААТ «МАЗ» новага генеральнага дырэктара Аляксандра Бароўскага.

У 2008 годзе Вярхоўны суд прыгаварыў кіраўніка «Белнафтахіма» Аляксандра Бароўскага да пяці гадоў турмы за злоўжыванне паўнамоцтвамі, учыненае з асабістай зацікаўленасці. Праўда, ужо 22 снежня 2008 года Бароўскага вызвалілі з калоніі ў Бабруйску згодна з указам Лукашэнкі аб памілаванні. Да кіраўніка краіны з просьбай аб літасці Бароўскі акурат і звяртаўся.

Прызначэнне пакараных і памілаваных Праляскоўскага і асабліва Бароўскага выглядае найбольшым знакам у апошняй перастасоўцы. Прыгадваецца стары анекдот пра Сталіна і ягоную кадравую палітыку: «Таварыш Жукаў, вас яшчэ не расстралялі?»

**Зміцер Панкавец**

## Таццяну Шапуцьку адлічылі — Козік не заступіўся

**Прэс-сакратар «Маладога фронту» Таццяна Шапуцька 3 снежня была адлічаная з Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Яна навучалася на другім курсе юрыдычнага факультэта па спецыяльнасці «юрыст-палітолаг».**

«Мяне выклікалі з пары ў дэканат. Там паведамілі, што я адлічаная з універсітэта. Загад за подпісам рэктара БДУ Сяргея Абламейкі», — падзялілася ўражаннямі Таццяна Шапуцька.

Пазней стала вядома, што дзяўчыну выключылі за ўдзел у Форуме грамадзянскай супольнасці, што праходзіў у лістападзе ў Бруселі. Таццяна выехала за мяжу без дазволу ўніверсітэта, што забараняецца. У 2005 годзе такі самы выпадак адбыўся са студэнткай «наргаса» Таццянай Хомай.

Шапуцька была адной з найлепшых студэнтак, яе сярэдні бал — 8,5. Да зімовай сесіі заставаўся тыдзень.

У тым Форуме ўдзельнічаў і старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Леанід Козік. Ён абяцаў дзяўчыне дапамогу ў выпадку праблемаў на вучобе з-за грамадскай дзейнасці. І нават абяцаў сам арганізаваць акцыю ў яе падтрымку. Таццяна некалькі разоў тэлефанавала да галоўнага прафсаюзніка, але той не здымаў слухаўку.

На выхадных на сайце ФПБ з'явіўся афіцыйны каментар Леаніда Козіка. «Што тычыцца Таццяны Шапуцькі, то гэта класічны жыццёвы выпадак. Калі яна адлічаная з універсітэта за тое, што брала ўдзел у працы Форума, то гэта не адпавядае заканадаўству Беларусі. Калі ж яна адлічана за тое, што яна без дазволу адміністрацыі прагуляла заняткі і не наведвала ВНУ, то адміністрацыя мае права ўжыць дзейныя ў ВНУ правілы», — заявіў старшыня прафсаюзаў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Аднакурснікі Таццяны пачалі збор подпісаў, каб дзяўчыну аднавілі на вучобе. Таксама створаны аргкамітэт у абарону Шапуцькі, куды ўвайшлі вядомыя палітыкі, грамадскія і культурныя дзеячы.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### Пуцін пра крытыку Лукашэнкі: Можа, гэта каханне?

Уладзімір Пуцін падчас штогадовай тэлеразмовы з жыхарамі Расіі адказаў на пытанне, чаму ён не рэагуе на крытыку з боку А. Лукашэнкі, якая апошнім часам часта гучыць. «А, можа, гэта каханне? — жартам сказаў ён. — У нас таксама добрыя і цёплыя пачуцці ў адносінах да усяго беларускага народа і яго кіраўніцтва».

### Мілінкевіч — чыноўнікам: Не бойцеся

«Было б памылковым лічыць, што прыход новага прэзідэнта пацягне за сабой разгром існай улады. Разумныя людзі застануцца працаваць», — заявіў лідэр Руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч падчас анлайн-канферэнцыі на сайце «Белорусские новости».

### Прастытутак задзейнічалі ў правакацыі супраць Дзмітрука

У інтэрнэце з'явіўся гукавы файл, дзе нібыта запісаная размова сустаршыні БХД Георгія Дзмітрука з трыма прастытуткамі. «Оля, Лена і Оля» патрабуюць ад Дзмітрука грошы, якія ён як быццам вінен ім за паслугі і маўчанне. Сам Дзмітрук называе гэта правакацыяй спецслужбаў.

**ЗП**

# Бюджэт-2010: мільярд дэфіцыту

**Падатак на дададзеную вартасць усё ж вырасце да 20%.**

Міністр фінансаў Андрэй Харкавец прадставіў палаце прадстаўнікоў праект бюджэту на 2010 год. Згодна з праектам, наступны год краіна пражыве ў мінус. Прыбыткі бюджэту чакаюцца ў памеры 53 трлн рублёў, а выдаткі — 55,7 трлн рублёў. Дэфіцыт складзе каля мільярда даляраў.

### Краіна аптымістаў

Беларусь будзе трымацца перспектыўнага плану развіцця. Прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі абяцаў прадставіць Лукашэнку два шляхі развіцця эканомікі — збалансаваны і фантастычны. Лепей за ўсё іх характарызуюць паказчыкі росту ВУП: пры першым ён складаў 2—3%, пры другім — 10—11%.

Урэшце, паміж двух варыянтаў быў абраны трэці, яшчэ больш фантастычны. Рост ВУП запланаваны ў памеры 12%. Зрэшты, і на гэты год чакаўся ўпэўнены пад'ём. У выніку за 10 месяцаў года ВУП упаў на 1%...

### Падатковая рэформа пойдзе ўверх

Галоўная рэформа, якая прымеркаваная на 1 студзеня 2010 года, закранае падатковую сістэму. З Новага года адбудзецца павелічэнне стаўкі падатку на дададзеную вартасць з 18% да 20%.

Размовы пра павелічэнне ПДВ ажно да 22% хадзілі яшчэ ўлетку. Тады прэм'ер Сідорскі і банкір Пракаповіч праінфармавалі пра гэта Міжнародны валютны фонд і атрымалі ўхвалу. Увосень у МВФ адправіўся чарговы ліст, дзе планаваная стаўка павялічвалася толькі да 21%. Не ўсе прадстаўнікі ўлады падтрымліваюць рэформу — напрыклад, намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Леанід Анфімаў заяўляў, што праводзіць эканамічныя эксперыменты немэтазгодна. Цяпер да ідэі зноў вярнуліся, няхай і палавінчата.

Разам з тым будуць адмененыя некаторыя падаткі. Знікнуць мясцовыя падаткі на продаж, падаткі на продаж аўтатранспартных сродкаў і збор за карыстанне паркоўкамі. Мінфін выстаўляе ўладу альтруістамі — загадкавым чынам за кошт рэформы бюджэт недаатрымае 225 мільёнаў даляраў.

Перавага ПДВ у лёгкасці збору. Ад яго, у адрозненне ад іншых падаткаў, схавацца амаль нерэальна. Падатак уніфікаваны і дае пастаянны прыбытак бюджэту ў больш чым 150 краінах свету.

Найбольш адчувальны ўдар у выніку будзе нанесены па малым бізнэсе, які мае вялікую долю дададзенай вартасці. Раней прадпрыемствы выплачвалі падатак з продажу, атрымаўшы грошы ад пакупнікоў. Цяпер прыйдзецца плаціць дзяржаве яшчэ да таго, як тавар трапіць на рынак. Кампаніям давядзецца шукаць дадатковыя абаротныя сродкі. У выніку цэны могуць вырасці.

**Падатак на дададзеную вартасць у розных краінах**

Польшча — 22%
Латвія — 21%
Літва — 21%
Украіна — 20%
Беларусь — 20% (замест 18%)
Расія — 18%
Казахстан — 12%

### Не пабагацеем, але і не збяднеем

Заробкі ў 2010 г. будуць спрабаваць утрымацца на цяперашнім узроўні. Іх павелічэнне павінна скласці 8%, на столькі ж прагназуецца і інфляцыя.

Выдаткі на сацыяльныя патрэбы грамадства вырастуць на 15% у рублёвым выражэнні. Пры гэтым у даляравым выражэнні яны зменшацца прыкладна на 20%. На адукацыю будзе выдзелена 7,6 трлн. рублёў. На ахову здароўя — 5,6 трыльёна.

Надыходзіць час аддаваць пазыкі. На абслугоўванне дзяржаўнага доўгу ў 2010 годзе выдаткоўваецца амаль паўмільярда даляраў. Летась было на 36% менш.

Урад спадзяецца, што парламентарыі паспеюць прыняць дакумент да канца года. Мяркуецца, што ў першым чытанні праект будзе разгледжаны 9 снежня, а праз дзень — у другім.

**Ягор Марціновіч**



# Навагоднія зніжкі: да 30%

У мінскіх магазінах пачаўся пашыраны перадНавагодні гандаль са скідкамі. «Гандаль дамаўляецца з прадпрыемствамі прамысловасці аб зніжэнні адпускных цэн і сам зніжае гандлёвыя надбаўкі», — тлумачыць намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Аляксей Раманаў. Паводле яго слоў, у гандлёвых прадпрыемствах па гэтай схеме зніжка можа скласці да 30% з улікам зніжэння толькі гандлёвых надбавак на 5—20%.

Раманаў таксама паведаміў, што ў магазінах завяршылася святочнае афармленне вітрын, секцый, аддзелаў, гандлёвых залаў. Пачаты спецыялізаваны продаж навагодніх атрыбутаў, падарачных набораў. Пройдзе 2 тысячы выстаў-продажаў тавараў і кулінарных вырабаў.

З 15 снежня да 10 студзеня гандлёвым прадпрыемствам і прадпрыемствам грамадскага харчавання забаронена зачыняцца на рамонт, інвентарызацыю, санітарныя дні. 25 і 31 снежня магазіны будуць працаваць па графіку працоўнага дня. З 15 снежня да 1 студзеня рэстараны і кафэ, размешчаныя па-за жылымі будынкамі, будуць працаваць да 6-й раніцы.

У адным Мінску плануецца прадаць каля мільёна бутэлек шампанскага і пеністых вінаў і каля мільёна кіляў кандытарскіх вырабаў.

**Паводле БелаПАН**

# Танная нафта — толькі за аб'екты

**Кіраўнік Мінэнерга Расіі Сяргей Шматко заявіў, што працяг ільготнай расійскай нафты для Беларусі магчымы толькі ўзамен інфраструктурных аб'ектаў.**

«У нас распрацавана галіновая прапанова беларускім нафтавікам, якая звязана з тым, што працяг ільготнага рэжыму будзе звязаны з уваходжаннем расійскай кампаніі ў нафтавую інфраструктуру на тэрыторыі Беларусі», — прызнаўся чыноўнік.

Пазней з'явіліся каментары ананімнай крыніцы ва ўрадзе. Гэтыя заявы «інакш як шантажом нямožна назваць», — заявіла яна агенцтву «Інтэрфакс-Захад». «Па сутнасці, нам сказалі: хочаце і надалей нафту атрымліваць — аддайце за бясцэнак «Нафтан», — мяркуе крыніца.

**Сяргей Гезгала**

## СЦІСЛА

### Стаўка рэфінансавання складзе 9-12% гадавых

Стаўка рэфінансавання Нацбанка да канца 2010 года пры прагнозе інфляцыі складзе 9—12% гадавых. Гэта прадугледжана Асноўнымі кірункамі грашовай палітыкі на 2010 год. На канец 2010-га стаўкі па новых рублёвых крэдытах нефінансавага сектара складуць 12—15% гадавых, па новых тэрміновых рублёвых дэпазітах у банках — 10—13% гадавых. Калідор ваганняў курсу рубля вызначаны ў плюс-мінус 10 працэнтаў.

Варта адзначыць, што прагнозныя паказчыкі сёлета засталіся толькі на паперы.

### Беларускае ў крэдыт

Урад зацвердзіў новы пералік тавараў, для набыцця якіх малазабяспечаным грамадзянам даюцца льготныя крэдыты. У новы пералік увайшлі ровары, DVD-прайгравальнікі, духавыя шафы, убудаваныя духоўкі, вырабы сантэхкерамікі, дываны, камп'ютары, касцюмы і іншая прадукцыя беларускай вытворчасці. Ільготныя крэдыты можна атрымаць у «Беларусбанку», «Белінвестбанку» «БПС-Банку», «Белаграпрамбанку» тэрмінам да трох гадоў па стаўцы 10% гадавых. Атрымаць крэдыт могуць грамадзяне, сукупны даход на кожнага члена сям'і якіх не перавышае 1 млн 136 тыс. рублёў.

### Прадаецца савецкі вайсковы гарадок

Агенцтва прыватызацыі Латвіі выставіла на таргі вайсковы гарадок «Скрунда-1», дзе раней знаходзілася савецкая радыёлакацыйная станцыя.

Пачатковы кошт — $325 тысяч.

### Эстонскія прадукты патаннелі найбольш у Еўропе

Згодна з дадзенымі Еўракамісіі, у краінах Еўрасаюза прадукты патаннелі ў сярэднім на 1,5%. Найбольшае падзенне адбылося ў Эстоніі і Фінляндыі, дзе цэны зменшыліся на 7,2% і 6,8% адпаведна. Для параўнання, за той самы час у Беларусі цэны на прадукты харчавання выраслі на 4,5%.

**ЯМ**

# Абама натхніў даляр: 2815

**Мітусня курсаў валют працягваецца.**

Пасля аптымістычнага прагнозу Барака Абамы, які запэўніў амерыканцаў, што другой Вялікай дэпрэсіі не будзе, даляр рэзка пайшоў уверх. Амерыканская валюта падаражэла на 28 рублёў за дзень і ў панядзелак каштавала 2815 рублёў.

Гэта найбольшы паказчык даляра з пачатку восені. Еўра, у процівагу, пайшоў уніз. Ён апусціўся на 33 рублі і цяпер ацэньваецца ў 4167 руб. Суадносіны еўра і даляра складаюць 1,48. У выніку валютны кошык апусціўся яшчэ на сотыя долі працэнта. Дэвальвацыя з 2 студзеня гэтага года склала 8,13%.

Праўда, фінансавыя аналітыкі не думаюць, што рост даляра пераўтворыцца ў тэндэнцыю.

**ЯМ**

# Таталітарная дэнамінацыя

Паўночная Карэя праводзіць грашовую рэформу. На абмен грошай грамадзянам быў дадзены тыдзень. Ад мясцовых грошай — вонаў — адкінуліся два нулі. Але абмяняць грошы па курсу 100:1 можна было толькі ў памеры, прыкладна роўным тысячы даляраў па афіцыйным курсе. Астатнія наяўныя, як і ўсе грошы на банкаўскіх рахунках, абменьваліся па менш выгадным курсе. Так урад канфіскаваў багацці, атрыманыя ад «спекуляцыі» і «незаконнай дзейнасці». Грошы, вывезеныя за мяжу, не абменьваюцца.

Цікава, што банкноты былі надрукаваныя яшчэ ў 2002 годзе, але выкарыстаныя толькі зараз.

Па курсу Нацбанка ад 1 снежня 1000 вонаў каштавалі як 2400 рублёў.

**ЯМ**

# Двайная гульня Анатоля Ляўковіча

Працяг са старонкі 1.

Гэты ручны орган быў створаны для сувязі паміж грамадзянскай супольнасцю і ўладай. Грамадская палата лаяльная да сённяшняга расійскага кіраўніцтва, хоць туды і ўваходзяць некалькі «канструктыўных» апазіцыянераў. Ляўковіч загарэўся ідэяй стварэння такой самай палаты ў Беларусі, каб потым можна было сфармаваць «саюзную».

Ляўковіч перакананы, што «паспяховая рэалізацыя гэтага праекта магчымая толькі пры падтрымцы кіраўніцтва Расіі і Беларусі».

У заключэнні старшыня сацыял-дэмакратыі прапаноўвае Сяргею Міронаву падпісаць паміж БСДП і «Справядлівай Расіяй» дамову аб супрацоўніцтве.

У гутарцы з карэспандэнтам «НН» Анатоль Ляўковіч не абвяргаў наяўнасць такога ліста. «У нас ёсць шэраг ініцыятываў як на Захадзе, так і на Усходзе. Гэта ліст расійскаму партнёру», — расказвае А.Ляўковіч.

«Справядлівая Расія» была створаная ў 2007 годзе. Яе ядро склалі шавіністычная партыя «Родина», Расійская партыя жыцця і Расійская партыя пенсіянераў. «Справядлівая Расія» пазіцыянуе сябе як сацыял-дэмакратычная партыя.

На апошніх выбарах у Думу «Справядлівая Расія» змагла трапіць у парламент. Ліберальная расійская апазіцыя называе партыю Міронава левым адгалінаваннем «Адзінай Расіі».

Анатоль Ляўковіч кажа, што галоўнай мэтай ягонага ліста ёсць больш актыўны ўдзел грамадзянскай супольнасці ў дыскусіі адносна інтэграцыйных працэсаў. «Інтэграцыйную рыторыку цалкам перахапіў Чырвоны Дом і Крэмль, а гэта няправільна, так не мусіць быць», — кажа Ляўковіч.

Як тады гэта вяжацца з заявамі, што грамадская палата можа быць створаная толькі пры падтрымцы ўладаў абедзвюх краін? «Я сыходзіў ад прыроды тых рэжымаў, якія цяпер у кіраўніцтве Беларусі і Расіі. Добра быць проста рамантыкам у палітыцы, але мне ўжо гэта надакучыла. Трэба падыходзіць да пытанняў рацыянальна і прагматычна. Трэба стукацца ва ўсе дзверы. Ёсць такія, якія могуць адчыніць. На вайне як на вайне. Трэба і ў гразі пакачацца, а не толькі сядзець у белым чыстым мундзіры», — сказаў «НН» старшыня БСДП.

«Першы раз чую пра гэта з вашых вуснаў», — здзівіўся Анатоль Лябедзька, старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі, партнёра сацыял-дэмакратаў па АДС, якога мы папрасілі пракаментаваць ініцыятыву Ляўковіча.

У кіраўніцтве БСДП пацвердзілі, што ідэя належала асабіста Анатолю Ляўковічу, пра яе не ведалі ягоныя намеснікі. Тым не менш, ініцыятыва, якой мог бы пазайздросціць сам Астап Бэндэр, выніку не прынесла — адказ з Масквы так і не прыйшоў.

Гэта не першы выпадак сёлета, калі Анатоль Ляўковіч трапляе ў непрыемную для сябе гісторыю. Першы быў звязаны з інтэрв'ю палітыка газеце «Советская Белоруссия», дзе старшыня БСДП рассыпаўся ў кампліментах сённяшняй уладзе.

Раней з інтэграцыйнымі заявамі выступаў таксама старшыня ПКБ Сяргей Калякін. Ён выказваўся за ўвядзенне адзінай валюты, а таксама за прызнанне Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Тыя словы Калякіна былі ўспрынятыя ў штыхі большасцю лідэраў апазіцыі.

**Зміцер Панкавец**

**Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада)**

Рэспубліка Беларусь,
220095, г. Мінск,
пр-т Ракасоўскага,
д. 52/1, пам. 241А
тэл./факс (017) 246 86 94
e-mail: bsdp_minsk_ck@tut.by

«08» кастрычніка 2008 г.

на _______ ад «__» ___________ 2008 г.

Председателю Политической партии
«Справедливая Россия»
С.М.Миронову

«О новых возможностях развития интеграционных процессов»

Дорогой Сергей Михайлович, здравствуйте!

Вы информированы о политической, экономической и социальной ситуации в Беларуси. В стране нарастают проблемы, разрешение которых требует иных мер в сравнении с теми, которые реализуются. Это в полной мере касается отношений Беларуси с Россией. Позиция БСДП в этом вопросе Вам известна и заключается в емкой формуле «Россия – стратегический союзник, Запад – стратегический партнер Беларуси». Только успешная реализация такой стратегии позволит нашей стране стать на путь динамичного развития и системно решать назревшие проблемы.

Успешная реализация этого проекта возможна только при поддержке руководства России и Беларуси. Как нам представляется, создание Союзной Общественной палаты может быть поддержано белорусским руководством, если эта инициатива будет исходить от российского руководства и российской общественности. Наша партия готова взять на себя ответственность за организационные действия по формированию белорусской Общественной палаты, которая представит самые широкие слои общества и тем самым вызовет доверие абсолютного большинства граждан Беларуси.

Сергей Михайлович! Пользуясь случаем, вновь предлагаем рассмотреть вопрос о заключении между БСДП и партией «Справедливая Россия» Договора о сотрудничестве. Соответствующее предложение БСДП находится в аппарате Вашей партии ( у Н.В.Левичева).

С уважением и социал-демократическим приветом,
Председатель БСДП — Анатолий Левкович

# Эскадроны страху

## Хто выкрадае людзей у Беларусі?

5 і 6 снежня адбыліся два аднолькавыя інцыдэнты з лідэрамі апазіцыйных суполак моладзі. Невядомыя напалі спачатку на Зміцера Дашкевіча, а пасля на Яўгена Афнагеля і вывезлі іх за горад.

У суботу 5 снежня прадстаўнікі дзевяці ініцыятыў, сярод іх «Малады фронт», «Правы альянс» сабраліся ў скверы Янкі Купалы дзеля стварэння кааліцыі «Новае пакаленне». Дашкевіч на сустрэчу не прыйшоў. Ягоны тэлефон маўчаў. Звароты ў РУУСы плёну не далі. Толькі ў 16.30 Зміцер выйшаў на сувязь.

У 10.30, калі ён выходзіў з кватэры, з верхняй пляцоўкі да яго падскочылі два дзецюкі, павалілі і заляпілі вочы і рот. Выцягнулі на вуліцу, кінулі ў мікрааўтобус і павезлі.

### Шыпела рацыя

У Зміцера адабралі рэчы, на галаву нацягнулі дзве шапкі. Некалькі гадзін яго вазілі ў адным мікрааўтобусе, затым, стварылася ў яго ўражанне, перасадзілі ў іншы.

У першым бусе невядомыя казалі яму нешта накшталт «колькі ты яшчэ будзеш хадзіць да маёй Марыны». Пры гэтым было чуваць, як у аднаго з нападнікаў час ад часу шыпела рацыя. У другім аўто выкрадальнікі маўчалі, для размовы спыняліся і выходзілі. Урэшце мікрааўтобус стаў, адзін з невядомых сказаў: «Пайду капаць». І выйшаў.

Праз хвілін дваццаць Зміцера выцягнулі з аўто, прасунулі праз рукавы паліто кол, каб абмежаваць яго ў рухах, загадалі лічыць да ста і сышлі.

Хлопец здолеў вызваліцца. Дайшоў да вёскі Антонаўка (Лагойскі раён, пад Плешчаніцы) і патэлефанаваў сябрам.

У Мінску ён адразу ж накіраваўся ў РУУС Заводскага раёна пісаць скаргу. Вынікам заявы стаў візіт міліцыянтаў на «месца злачынства» і вынас з кватэры Зміцера кніг і падпісных лістоў за беларускую мову.

«Гэта нагадвае цырк — амбалы вывозяць у лес юнакоў», — кажа Дашкевіч. Ён лічыць, што гэта рабілі людзі з аховы Лукашэнкі, хоць даказаў ніякіх не мае.



КАДР З ВІДЭА НА NN.BY

### «Будзеш пытацца — паедзем далёка»

На наступны дзень, 6 снежня, на вуліцы Бялінскага невядомыя запіхнулі ў аўто каардынатара грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Яўгена Афнагеля.

«А 16-й у мяне была прызначаная сустрэча каля завода «Луч». Стаю. Падышлі два чалавекі ў цывільным, паказалі міліцэйскія пасведчанні і папрасілі паказаць змесціва заплечніка. Нічога цікавага для сябе не знайшлі і сышлі. Потым побач з'явіўся міліцыянт у форме з рацыяй, не адыходзіў далёка. Я сеў у аўтобус і даехаў да вуліцы Бялінскага. Там на прыпынку мяне і схапілі. Запіхнулі ў белы легкавік і павезлі. У аўто былі тры чалавекі. Недзе 20 хвілін вазілі па горадзе, галаву мне нахілілі, каб не глядзеў у акно. Потым паехалі за горад. Праз пэўны час збочылі з трасы, недзе з кіламетр ехалі. А там мяне і высадзілі, аддалі фотаапарат, праўда без акумулятара, і тэлефоны, з аднаго батарэю выцягнулі», — распавёў Яўген.

Калі ён паспрабаваў задаваць нападнікам пытанні, яму сказалі: «Будзеш шмат пытацца — паедзем далёка, будзеш маўчаць — паедзем блізка».

Афнагеля адвезлі ў раён вёскі Каралёў Стан.

Падобныя інцыдэнты з моладзевымі актывістамі здараліся раней. 19 снежня 2008 г. невядомыя выкралі Артура Фінкевіча, вывезлі яго пад Валожын, збілі і выкінулі з аўто. 25 сакавіка 2009 г. Насту Палажанку і Дзяніса Карнова вывезлі ў гродзенскім кірунку. Дзяніса пры гэтым патаўклі.

**Выкраданне людзей — крымінальнае злачынства**

Дзеянні невядомых выкрадальнікаў трапляюць пад шэраг крымінальных артыкулаў, сцвярджаюць праваабаронцы. Так, артыкулы 182 — «Выкраданне чалавека» і 183 — «Незаконнае пазбаўленне волі» на юрыдычнай мове трактуюцца як «Злачынствы супраць асабістай свабоды, гонару і годнасці» (арт. 22 КК). Пакаранне — да 7 гадоў пазбаўлення волі. Эксперт Беларускага Хельсінскага камітэта Гары Паганяйла дапускае, што выкраданні моладзевых актывістаў можна кваліфікаваць і больш жорстка — паводле арт. 424 альбо 426: «Калі гэтыя дзеянні ажыццявілі спецслужбы, гэта можа быць злоўжыванне ўладай альбо службовымі паўнамоцтвамі, альбо перавышэнне ўлады».

### «Ну, вы ж усё разумееце».

У панядзелак 7 снежня гісторыя з выкраданнямі мела працяг. Супрацоўнікі ДАІ спынілі аўто і затрымалі фотакарэспандэнта «НН» Юлію Дарашкевіч, якая ехала на інтэрв'ю са Зміцером Дашкевічам. Характэрна, што перад гэтым яна патэлефанавала калегу і паведаміла, куды і навошта едзе. Журналістку адвезлі ў ДАІ, заявіўшы, што з яе аўто «праблемы» — трэба, маўляў, праверыць нумар кузава. Неўзабаве Юлію адпусцілі са словамі «ну, вы ж усё разумееце». Гэта першы падобны выпадак у ейнай дзейнасці.

**Сямён Печанко**

**КАМЕНТАР**

### Севярынец: За інцыдэнтамі стаіць некантраляваная пракуратурай і МУС структура

Сустаршыня аргкамітэта Хрысціянскай дэмакратыі Павал Севярынец лічыць, што мэта выкраданняў — запалохванне. І не столькі канкрэтна тых, каго выкрадаюць, колькі грамадства, моладзі ўвогуле. Другая мэта — трэніроўка пэўных спецслужбаў, адпрацоўка метадаў, — мяркуе П.Севярынец. На ягоную думку, за інцыдэнтамі стаіць некантраляваная пракуратурай і МУС структура. Магчыма, падобная да колішняга падраздзялення Паўлічэнкі, якога падазравалі ў датычнасці да выкраданняў канца 1990-х.



# Міс Даніі — грамадзянка Беларусі

**Ліза Ленц, шматразовая чэмпіёнка Даніі і свету па таэквандо і Міс Данія–2008, нарадзілася ў Беларусі.**

Першыя адзінаццаць гадоў свайго жыцця дацкая чэмпіёнка і проста прыгажуня пражыла ў Беларусі. Яна нарадзілася 15 снежня 1986 года, а ў Данію трапіла з бацькамі ў 1997-м. Бацька Лізы звярнуўся тады да дацкіх уладаў з просьбай прадаставіць сям'і статус бежанцаў у сувязі з палітычным пераследам на радзіме. Аднак дацкія ўлады пастанавілі, што сям'я Ленцаў абсалютна не мае дачынення да палітыкі, і ў 2003 г. выслалі іх з краіны. Ленцы адмовіліся вяртацца ў Беларусь. Пасля кароткачасовага знаходжання ў Латвіі і Літве вярнуліся ў Данію.

Ліза Ленц толькі ў 2007 г. атрымала пасведчанне на права жыхарства ў Даніі, і, у адпаведнасці з дацкім заканадаўствам, пакуль не мае права на дацкае грамадзянства.

Расповеды Лізы аб цяжкім дзяцінстве ў Беларусі, уцёках ад «апошняга дыктатара Еўропы» і аб часе, праведзеным у Сандхольмскім лагеры для ўцекачоў толькі выклікаюць да яе сімпатыю датчанаў. Аднак тое, што Ліза ў інтарэсах кар'еры пайшла на свядомы падман, наўрад ці дадасць беларусцы папулярнасці.

**Зміцер Гурневіч**

# У Беларусі «Батьку» не пускаюць у продаж

Гандлёвы брэнд «Батька» быў зарэгістраваны на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі фірмай «ЛіК», што належыць Юрыю Рудніцкіх. На думку прадпрымальніка, новы брэнд павінен карыстацца папулярнасцю не толькі ў грамадзян Беларусі, але таксама і ў расійцаў. Спадар Рудніцкіх не спыніўся на рэгістрацыі новай маркі ў Расіі, а паспрабаваў пачаць прасоўванне яе і ў нашай краіне. Праўда, у беларускіх уладаў гэтая ідэя ніякага энтузіязму не выклікала.

«Нягледзячы на нормы заканадаўства, якія выразна абмяжоўваюць перыяд, у які заяўнік павінен азнаёміцца з рэакцыяй на свой зварот, ніхто так і не адважыўся прыняць хаця б нейкае рашэнне», — скардзіцца Ю.Рудніцкіх. «Мы пісалі і ў Савет міністраў, і нават кіраўніку Адміністрацыі прэзідэнта РБ ... І прэзідэнту вашаму мы пісалі. Але адказваюць, дакладней, не адказваюць ўсе тыя чыноўнікі. Ні станоўчага, ні адмоўнага адказу




не даюць».

**АП, паводле «Белорусы и рынок»**

# Экс-дырэктару Дэпартамента фінансавых расследаванняў прад'яўленае абвінавачанне

**Анатоля Грамовіча вінавацяць у стварэнні ў буйной злачыннай арганізацыі. Эпізод адносіцца да ягонай бытнасці намеснікам начальніка КДБ па Брэсцкай вобласці.**

Былога кіраўніка Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю Анатоля Грамовіча арыштавалі 15 студзеня 2009 года. Генпракуратура выставіла Грамовічу надзвычай сур'ёзныя абвінавачанні — яму закідваецца стварэнне злачыннай арганізацыі ці ўдзел у ёй, здзейсненыя службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў (ч.3 арт.285 КК). Паводле гэтага артыкула, экс-дырэктару ДФР пагражае ад 10 да 15 гадоў зняволення з канфіскацыяй маёмасці.

Матэрыялы гучнай справы датычаць падзеяў 2001 года. На той момант Грамовіч займаў пасаду намесніка начальніка Упраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці.

### Фурамі праз мытню

Па версіі следства, за перыяд з мая па жнівень 2001-га праз мытню ў Брэсце ў накірунку Расіі прайшло каля 750 фураў з дарагой мэбляй, камп'ютарамі, вопраткай і абуткам. Увесь гэты груз нібыта быў афармлены ў якасці дробных партый мэблі, што завозіліся фізічнымі асобамі.

А на працягу кастрычніка таго ж года праз мытню «Заходні Буг» пад выглядам тратуарнай пліткі на 319 фурах былі завезеныя камп'ютары і вопратка.

У выніку ў абодвух выпадках бюджэт не атрымаў мытных адлічэнняў больш за 10 і 20 млрд рублёў адпаведна. Паводле следства, у справе былі замешаныя супрацоўнікі мытні (у матэрыялах следства фігуруюць мытныя пасты «Казловічы» і «Заходні Буг», унутраны пункт мытнага нагляду «Брэстзнешгранс»), МУС і КДБ, а таксама камерсанты.

### Чэкісты прыкрывалі мытнікаў

Справа Грамовіча — адна з шэрагу буйных антыкарупцыйных спраў Генпракуратуры, датычных выяўлення злачынных арганізацый і груповак на заходняй мяжы краіны. На першых пасля арышту прэс-канферэнцыях чыноўнікі Генпракуратуры рознага рангу заяўлялі, што падазрэнні наконт Грамовіча датычаць чэкісцкага перыяду ягонай кар'еры.

У 2002 годзе яго прызначылі на пасаду дырэктара рэарганізаванага у Дэпартамент Дзяржкамітэта фінансавых расследаванняў. У той час кіраваў Камітэтам дзяржкантролю Анатоль Тозік.

На пасадзе галоўнага фінансавага міліцыянта Анатоль Грамовіч праслужыў да 2006 года, яго адправілі ў адстаўку, а затым і на пенсію ў 2006 годзе, неўзабаве пасля сыходу з пасады Тозіка. Услед за Грамовічам пасадаў пазбавіліся амаль усе ягоныя падначаленыя. Адразу пасля адстаўкі пачаліся размовы пра магчымы хуткі арышт экс-дырэктара, аднак у рэальныя дзеянні гэтыя размовы ўвасобіліся толькі ў студзені гэтага года.

### Сапраўдны чэкіст

Даведацца нейкія падрабязнасці брэсцкай кар'еры Анатоля Грамовіча не так проста. Намеснік галоўнага рэдактара газеты «Вечерний Брест» Барыс Паўлоўскі не здолеў прыгадаць, ці пісала ягонае выданне пра Грамовіча цягам апошніх васьмі гадоў. «Сапраўдны чэкіст не пакідае па сабе слядоў», — аджартаваўся Зміцер Шыманскі, кіраўнік брэсцкай філіі Партыі БНФ.

З ранейшых інтэрв'ю, якія даваў Грамовіч ужо ў якасці кіраўніка ДФР, можна даведацца, што абодва ягоныя дзяды былі раскулачаныя. Былы галоўны фінансавы міліцыянт захапляўся більярдам.

**Сямён Печанко**

# Вайцюшкевіч на «Зорным рынгу»: «Я нарадзіўся тут»

**Лідэр WZ-Orkiestra перамог у інтэрактыўным шоу тэлеканала СТВ экс-вакаліста ВІА «Синяя птица» Аляксандра Звяровіча.**

5 снежня на канале СТВ на «Зорным рынгу» сышліся Зміцер Вайцюшкевіч і Аляксандр Звяровіч, экс-вакаліст ВІА «Синяя птица». Зміцер Вайцюшкевіч выйшаў супраць гурта свайго суперніка адзін. Спяваючы «Я нарадзіўся тут», Зміцер зрабіў заўважны акцэнт на словах пра «белыя і чырвоныя кветкі». Каментатары шоу, якія час ад часу з'яўляліся ў кадры, пры гэтым эмацыйна падкрэслілі: «Наш чалавек, наш!»

Большасць пытанняў Вайцюшкевічу задавалі па-беларуску, на беларускай мове было пазначанае ягонае імя побач з нумарам тэлефона для галасавання. Зміцер, натуральна, размаўляў на роднай мове. Вынікі галасавання зафіксавалі ўпэўненую перамогу лідэра WZ-Orkiestra: 5364 галасы супраць 3943. 12 снежня на «Зорным рынгу» сыдуцца «Крама» і скандальная расійская спявачка Лаліта




Міляўская. Прагаласаваць можна будзе ў дзень эфіру (тэлефанаванне бясплатнае), а таксама на сайце СТВ. Пачатак у 20.10.

**СП**

## СЦІСЛА

### Жыхар Заслаўя кінуўся пад электрычку

На станцыі Аляхновічы спрабаваў скончыць жыццё самагубствам 22-гадовы жыхар Заслаўя. Малады чалавек кінуўся пад электрацягнік Маладзечна — Мінск. Матывы ўчынку высвятляюцца.

### Вырашыў зарабіць пад Новы год

Амаль 1,5 тыс. піратэхнічных вырабаў канфіскавана ў жыхара Брэста. Ён быў затрыманы на рынку, дзе прадаваў піратэхніку кітайскай вытворчасці розных найменняў без дакументаў, сертыфікацыі і адпаведных інструкцый па бяспечным ужыванні.

### Унук падазраецца ў забойстве дзядулі і бабулі

У вёсцы Вішні Касцюковіцкага раёна зніклі муж і жонка 1933 і 1936 г.н. Міліцыя знайшла іх целы з чэрапна-мазгавымі траўмамі, закапаныя на гародзе. Папярэдне ўстаноўлена, што замардаваў іх 23-гадовы ўнук, непрацуючы жыхар вёскі Машавое. Ён патрабаваў грошы, атрымаўшы адмову, забіў сякерай.

### Выбух у Бабруйску

40-гадовы жыхар Бабруйска падазраецца ў тым, што прывёў у дзеянне самаробнае выбуховае прыстасаванне. У выніку пашкоджаныя шыбы ў шасці кватэрах. Матывы высвятляюцца. Следствам устаноўлена, што затрыманы набыў прыстасаванне ў 21-гадовага калегі па працы. У дачыненні да маладога чалавека распачатая крымінальная справа. У яго дома знойдзены хімічныя і механічныя складнікі, з якіх можна вырабіць выбуховае прыстасаванне.

### У Оршы асудзілі 14-гадовага серыйнага злодзея

Днямі ў Оршы выслухаў прысуд 14-гадовы хлопчык. За некалькі месяцаў школьнік здзейсніў па меншай меры адзінаццаць крадзяжоў на рынках, у крамах. Хлопец цягаў не прысмакі, а кашалькі. Яму прысудзілі адбыць у выхаваўчай калоніі паўтара года.

**Паводле БелаПАН, Intex-press, «Еўрарадыё»**

# Іван Шыла: Дзякуй войску, што я стаў самастойным

Лідэр салігорскай апазіцыйнай моладзі Іван Шыла камісаваны рашэннем медкамісіі. 3 снежня скончыўся ягоны тэрмін службы. Усяго ў вайсковай частцы пасёлка Межыца (Лепельскі раён) Іван прабыў больш за 10 месяцаў. Прычына камісіі — моцная алергія, магчыма, на мясцовую ваду. Дактары палічылі, што Іван з такім захворваннем не можа працягваць службу.

**«Наша Ніва»: Якія першыя ўражанні пасля дэмбелю?**

**Іван Шыла:** Радасныя. Кожны салдат ідзе дадому з радасцю, незалежна ад таго, колькі ён адслужыў. У любым разе, войска — гэта абмежаванне волі, а вяртанне вельмі прыемнае. Мой погляд на войска таксама змяніўся, можа таму, што яно засталося недзе ззаду. Цяпер я гляджу на яго больш-менш пазітыўна. І лічу, што вайсковы досвед пайшоў мне на карысць.

**«НН»: А што менавіта было пазітыўнага?**

**ІШ:** Гэта іншы свет, іншыя людзі, з якімі я рэдка сутыкаўся да гэтага. Усе мае аднакласнікі паступілі ва ўніверсітэты. У людзей, якіх прызываюць у армію, іншыя каштоўнасці, іншае бачанне свету, прыярытэты. Войска дае магчымасць пажыць у гэтым калектыве, адаптавацца, выбудаваць свае прынцыпы. У нейкім сэнсе гэта праверка на трываласць. Войска дае магчымасць пераасэнсаваць зробленае, бо на ранейшае жыццё глядзіш з нейкай дыстанцыі. Ты жывеш калі не ў экстрэмальных, то ў незвычайных і цяжкіх умовах. Падчас начных нарадаў, дзяжурстваў ёсць магчымасць застацца сам-насам з сабой, пад рукі трапляе добрая кніжка. Ідэальныя ўмовы, каб падумаць, нешта запісаць, прачытаць. Навучыцца вырашэнню побытавых праблемаў. Хай гэта абіранне бульбы, шыццё ці нейкі рамонт. Я не магу сказаць, што лепш для чалавека: ісці ў войска ці з'ездзіць у Аўстралію. Важна, як чалавек скарыстае гэты досвед.

**Іван Шыла**

нар. 25 лістапада 1990 у Салігорску. Лідэр салігорскае апазіцыйнае моладзі. Затрымліваўся міліцыяй больш за паўсотні разоў. У чэрвені 2008 быў адлічаны са школы за дзень перад апошнім экзаменам. У студзені прызваны праходзіць тэрміновую службу ў вёсцы Межыца (Лепельскі раён). Камісаваны 3 снежня 2009.

**«НН»: А што, наадварот, было негатыўнага?**

**ІШ:** Звяртаешся да непатрэбных нагрузак, да працы дзеля працы. Кожны бачыць галечу войска, а праз гэтую галечу нельга гаварыць пра баяздольнасць. У войску нават месца ў прыбіральні дзеляць паводле тэрміну службы. Калі чалавек слабы і прыходзіць служыць — гэта страшна. У такіх калектывах мусяць быць слабыя людзі, якіх цкуюць, зневажаюць...

Праблем безліч. Гэта беларуская афіцэры, якія п'юць, крадуць, якія не могуць звязаць двух словаў, але маюць вышэйшую адукацыю. У мяне ёсць шмат пытанняў да Вайсковай акадэміі. Войска — гэта вялікая фікцыя. Людзей прызываюць не бараніць Радзіму, а прытрымліваць на сваёй спіне сценку, якая падае. Я служыў у «інтэлектуальных» войсках супрацьпаветранай абароны, але хлопцы там не ведаюць слова «тапаграфія». Я быў адзін з трох салдатаў, якія з першага разу здалі ідэалагічную падрыхтоўку. Прычым, здаў на выдатна. Там пытанні не пра палітыку Лукашэнкі, а колькі ў Беларусі абласцей. І ніхто не ведае!

**Я быў адзін з трох салдатаў, якія з першага разу здалі ідэалагічную падрыхтоўку. Там пытанні не пра палітыку Лукашэнкі, а колькі ў Беларусі абласцей. І ніхто не ведае!**

Ніхто не ведае імя міністра абароны і ягонае званне.

**«НН»: А як у цябе складаліся адносіны з саслужбоўцамі?**

**ІШ:** Выдатна. Канечне, былі канфлікты. Але войска не тое месца, дзе ты можаш проста адмежавацца ад чалавека. Не, ты год, паўтара года знаходзішся з ім у адным памяшканні і мусіш неяк улагоджваць канфлікты. У войску можна давесці, што ты іншы чалавек, і гэта не страшна. Захаваць свае каштоўнасці. Заслужыць нармальнае стаўленне афіцэраў.

**«НН»: А з «дзедаўшчынай» сутыкаўся?**

**ІШ:** Асабіста я — не. Але «дзедаўшчына» ёсць. Яна мяняе форму, цяпер больш «дзедаўшчыны» грашовай, працоўнай. Мы ад гэтага далёка не адышлі. У войску гінуць людзі. Штогод з беларускай арміі ўцякае 30—40 чалавек. Любы салдат з любой часткі можа расказаць пра «дзедаўшчыну». Па ёй жыве 90-95% салдатаў. Многія афіцэры лічаць «дзедаўшчыну» эфектыўным і простым метадам падтрымання парадку. Па-за «дзедаўшчынай» жыць таксама можна. Усё залежыць ад канкрэтнага чалавека.

**«НН»: А праблемы з ужываннем беларускай мовы былі?**

**ІШ:** Не, не было. Там усё ж перада мной служыў Алесь Каліта. У Салігорску размаўляць па-беларуску мне было складаней, чым у войску. У Межыцы ўсе звыкліся, што Шыла гаворыць па-беларуску ўвесь час. Шыла гаворыць па-беларуску, калі прачынаецца і кладзецца спаць, калі падае каманды і ў прыватнай гутарцы. Усе ведаюць і вымушаны разумець гэтыя словы. А ў Салігорску ты прыходзіш да прадавачкі ў краму, якую, магчыма, больш і не пабачыш, і яна ўпершыню сутыкаецца з беларускай мовай.

**«НН»: Чаго табе найбольш не хапала ў войску?**

**ІШ:** Першыя месяцы не хапала жудасна інфармацыі, не хапала знаёмых. Пасля ўсё стала на свае месцы. Спачатку войска здавалася альтэрнатыўным, часовым, незразумелым светам. Пасля стала светам з тымі ж правіламі, праблемамі, сябрамі. Канечне, гэта свет з абмежаваннямі. Амаль аднаполы свет, але ён мне замяніў ранейшы. Я стаў спраўляцца з тымі нагрузкамі, што мне выпалі. І дзякуй войску, што я стаў больш самастойным.

**«НН»: Самым цяжкім было?..**

**ІШ:** Першыя два тыдні службы. Калі ты сутыкаешся з новымі правіламі, з новымі людзьмі. І табе трэба заслужыць тут нейкі статус, выбудаваць мадэль паводзінаў.

**«НН»: А як жа гаўптвахта?**

**ІШ:** Не хачу, каб праз гэты досвед праходзіў нехта яшчэ. Мяне пасадзілі на сем сутак у адзіночную камеру. Памер камеры тры метры на метр. Людзей бачыш 4—5 разоў у дзень. Раніцай на прыбіральню, на галенне даецца паўтары хвіліны. Ежу падаюць праз «кармушку». Часам выводзяць на шпацыр. Умовы на гаўптвахце непараўнальна горшыя за акрэсцінскія. Трэба ўвесь час сядзець, каб рукі былі бачныя. Кожныя 90 секунд у камеру зазірае ахоўнік. Чытаць нічога не даюць, не дазваляюць нават адціскацца. Пастаянна гараць дзве лямпачкі, жалюзі на вокнах шчыльна зачыненыя, што нельга разабраць дзень ці ноч. Па змене варты ў камеры адбываюцца шмоны.

**«НН»: Падчас службы ты пісаў шмат скаргаў у Міністэрства абароны, ніжэйшыя інстанцыі. Яны давалі вынік?**

**ІШ:** Так, давалі. Дробныя пытанні ўдавалася вырашаць. Вярнуць адпачынак хлопцам, які скарацілі праз знаходжанне на «губе». Дабіцца ўсталявання на тэрыторыі часткі таксафона. Казарма і лазня былі ўнесеныя ў спіс аб'ектаў, якія налета адрамантуюць. Паабяцалі ўсталяваць станцыю па абезжалезванні вады. Значна палепшала харчаванне пасля таго, як удалося сабраць сорак подпісаў з патрабаваннем палепшыць рацыён.

**«НН»: У нарады часта хадзіў?**

**ІШ:** За 10 месяцаў у нарадах быў больш за 80 разоў. Вайсковыя ідэолагі настойвалі на тым, каб у мяне ўвесь час былі дысцыплінарныя спагнанні. А гэта аўтаматычна павялічвае колькасць нарадаў. Восенню за службу мне абвясцілі падзяку, але пасля прыезду аднаго такога ідэолага яе знялі.

**«НН»: Фізічна ў войску ўмацаваўся?**

**ІШ:** Супрацьпаветраныя войскі — не спецназ і не дэсант. Усё залежыць ад чалавека. Ёсць турнік, пара трэнажораў, урэшце, прастора ля свайго ложка, дзе ніхто не замінае адціскацца. Раз ужо выпала магчымасць, стараўся болей займацца спортам і чытаць. Кніжак прачытаў паўсотні. А замест чатырох разоў стаў падцягвацца 14. Адціскаюся 70 разоў.

**«НН»: Якія планы на будучыню?**

**ІШ:** Кароткатэрміновыя — пабачыцца з сябрамі, пагаварыць. Адназначна хачу атрымліваць адукацыю. Быць ідэйным маладым чалавекам, маладафронтаўцам без адукацыі — шлях у нікуды, тупік.

**«НН»: А што б параіў тым хлопцам, якія служаць цяпер ці маюць пайсці ў войска?**

**ІШ:** Можа быць, каб яны ішлі ў войска не толькі для таго, каб капаць акопы, піць гарэлку, спяваць армейскія песні і разважаць пра вайсковую рамантыку. Гэты час можна выкарыстаць на ўдасканаленне войска і саміх сябе.

**Гутарыў Зміцер Панкавец**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Франак Вячорка ў шпіталі**

Франка Вячорку — іншага палітрэкрута, які служыць у Мазыры, даставілі ў інфекцыйнае аддзяленне мясцовага шпіталя. У яго была тэмпература, кашаль. Медыкі паставілі дыягназ «Вострая рэспіраторная вірусная інфекцыя». Разам з Франкам у бальніцу трапілі некалькі дзесяткаў салдат, а таксама старшына. Хворым прапісалі лек «Таміфлю». Цяпер Вячорку палепшала, ён рыхтуецца да выпіскі.

Мазыр — адзін з самых уражаных эпідэміяй грыпу гарадоў. Паводле афіцыйных звестак, ад ускладнення грыпу і ВРВІ — пнеўманіі — за кастрычнік–лістапад памёрла 9 чалавек.

# На чым будзем ездзіць пасля Новага года?

**На пакупку недарагой патрыманай іншамаркі засталося паўгода.**

Па інфармацыі Белстата, 33% домагаспадарак у краіне маюць уласныя аўтамабілі. На уліку ў ДАІ стаіць больш за 2,2 млн аўто. Праўда, далёка не кожнае на хаду. Пераважная большасць — патрыманыя еўрапейскія маркі. Хоць і агульная доля савецкіх і расійскіх машын немалая. «Жыгуля» яшчэ не могуць абагнаць ні «Фальксваген», ні іншыя заходнікі.

**Самыя папулярныя аўтамабілі ў Беларусі**

«Жыгулі» — 18%

«Фальксваген» — 13%

«Масквіч» — 8%

«Аўдзі» — 7,5%

«Форд» — 7%

«Опель» — 6,5%

«Запарожац» — 5%

## Навагодні падарунак беларусам

Мыты на патрыманыя іншамаркі ў Беларусі ў некалькі разоў меншыя, чым у Расіі. Але з пачаткам дзейнасці ўмоваў Мытнага саюза яны зраўнаюцца.

Напрыклад, зараз аўтамабіль 2003 г.в. з аб'ёмам рухавіка 2000 куб см можна ўвезці ў Беларусь, заплаціўшы 800 еўра за размытненне, а з 1 студзеня 2010 года гэтая сума вырасце да 8 тыс. еўра. Праўда, для юрыдычных асобаў.

**Для простага спажыўца мыты застануцца на ранейшым узроўні прынамсі да ліпеня 2010 года. Пры гэтым адзін чалавек мае права ўвезці на тэрыторыю Беларусі не больш за адзін аўтамабіль у год.**

## Новае аўто — не па кішэні

Старшыня праўлення Беларускай аўтамабільнай асацыяцыі Сяргей Міхневіч заяўляе, што з павышэннем мытаў аўтамабілі нерасійскай вытворчасці падаражэюць у аўтадылераў прыкладна на 4 тысячы даляраў.

Як мяркуюць аналітыкі аўтарынка, паводле вынікаў года чакаецца зніжэнне продажаў новых аўтамабіляў у Беларусі на 50% у параўнанні з 2008 годам. Увядзенне новых мытаў адсуне беларускі аўтарынак да ўзроўню 1998—1999 гадоў.

Напрыклад, новы Volkswagen Passat Lim Trendline зараз каштуе $23 тысячы па каталогу, з іх на размытненне ідзе $1650. Пасля Новага года на мытні прыйдзецца пакінуць 30% ад кошту машыны — каля $7 тысяч. Розніца ў цане канкрэтнай мадэлі складзе $5,5 тысячы, якімі Расія хоча падтрымаць сваю аўтапрамысловасць.

## Удвая няшчасныя дылеры

Самае смешнае, што пакуль бядуюць аўтадылеры ў Беларусі, настолькі ж гаротнымі выглядаюць і дылеры ў Расіі. Прычыны аднолькавыя — кампаніі не змогуць вытрымліваць канкурэнцыю з беларускімі прыватнікамі.

Дырэктар па стратэгічным развіцці аднаго з найбуйнейшых дылераў, «Атлант-М», Аляксей Цярэшчанка лічыць, што за студзень—ліпень 2010 г. кемлівыя грамадзяне Беларусі паспеюць увезці некалькі сотняў тысяч іншамарак, каб пасля перагнаць іх у суседнюю Расію. Давер да машын заходняй зборкі ў расіян вышэйшы, чым да зробленых уласнымі рукамі, хай і па заходняй тэхналогіі.

## Катайцеся на беларускім

Тым, хто не давярае ні заходнім, ні расійскім вытворцам, а хоча «купляць сваё», варта дачакацца будаўніцтва аўтазавода ў Лідзе. Праект ацэньваецца ў 40 мільёнаў даляраў. На Гродзеншчыне змогуць выпускаць 20—30 тысяч машын у год, якія павінны вызначацца эканамічным расходам паліва. Прыкладны кошт новага беларускага легкавіка складзе 6 тысяч даляраў.

Не варта забывацца і на «Саманды». На іх мыты таксама не ўплываюць. Праўда, і аб'ёмы продажаў не радуюць вытворцаў. Не дзіва: цана новай машыны $13—15 тысяч.

## Машыны пачалі даражэць

Аўтарынак ужо зрэагаваў на хуткае павелічэнне мытаў. Цэнавая планка на патрыманыя машыны на мінскім, брэсцкім і гродзенскім аўтарынках за тыдзень скокнула на 400—600 даляраў. На адным з самых вядомых беларускіх аўтарынкаў у Гродне цэны за апошні месяц павысіліся больш чым на тысячу даляраў. Уздым продажу пачаўся недзе з канца верасня, калі пайшлі размовы пра новыя мыты. Як прагназуюць гандляры аўто, да канца года цэны не спыняцца.

## Туры па машыны

Існуюць спецыяльныя кампаніі, якія арганізоўваюць «туры па машыны». Як у Грэцыю турыстаў прывозяць купляць футры, так у Літву ладзяцца арганізаваныя паездкі для ахвотных прыдбаць аўто.

Паслуга каштуе каля $350. У гэтыя грошы ўваходзіць афармленне шэнгенскай візы, пражыванне ў гатэлі, транзітны нумар, паліва і страхаванне аўтамабіля... У Літву ўсе купцы адпраўляюцца разам з супрацоўнікамі кампаніі. Там спецыялісты наглядаюць аўтамабілі, афармляюць дакументы, і кліент вяртаецца ў Беларусь ужо на сваёй машыне.

Паколькі бліжэйшыя паўгода фізічныя асобы могуць прывозіць аўтамабілі па ранейшых мытах, у людзей з камерцыйнай жылкай з'явілася бізнэс-ідэя. Трэба на ўсе грошы набрацца машын, а пасля ехаць прадаваць іх расіянам, якія ўсё яшчэ пакутуюць ад высокіх цэн. Паколькі аднаму чалавеку можна ўвозіць не больш за адну машыну ў год, у інтэрнэце павялічылася колькасць аб'яваў: «Шукаю кампаньёна для прыгону аўто». Паслуга ацэньваецца ў $50—100.

Найбольш папулярныя аўтарынкі ў Літве: Клайпеда, Марыямпаль і Гаруны пад Вільняй. Прыбярэжная Клайпеда славіцца машынамі проста з парома, якія прыплыў з Германіі ці нават ЗША. Па літоўскай зямлі яны не праехалі ні кіламетра. Астатнія два рынкі — продаж еўра-

**Цяперашнія мыты на аўтамабілі ў Расіі і Беларусі для фізічных асобаў**

| Узрост машыны | Аб'ём рухавіка, куб см | Мыты ў РФ, еўра за куб см аб'ёма рухавіка | Мыты ў РБ, еўра за куб см аб'ёма рухавіка |
|---|---|---|---|
| Да 3-х гадоў | Да 1500 | 54%, але не менш за 3,5 | 0,6 |
| Да 3-х гадоў | 1800-2000 | 54%, але не менш за 5,5 | 0,7 |
| 3-5 гадоў | 1500-1800 | 2,5 | 0,4 |
| 3-5 гадоў | 1800-2300 | 2,7 | 0,4 |
| 5-7 гадоў | 1800-2300 | 4,8 | 0,4 |
| 5-7 гадоў | 2500-3000 | 5,8 | 0,6 |

**Стаўкі мытаў для юрыдычных асобаў з 1 студзеня 2010 для аўтамабіляў з бензінавым рухавіком**

| Узрост машыны | Аб'ём рухавіка, куб см | Стаўка мытаў і падаткаў, у працэнтах ад мытнага кошту, еўра за куб см аб'ёма рухавіка |
|---|---|---|
| Новыя | | |
| | Не больш за 1000 уключна | 30, але не менш за 1,2 |
| | 1000-1500 | 30, але не менш за 1,45 |
| | 1500-1800 | 30, але не менш за 1,5 |
| | 1800-2300 | 30, але не менш за 2,15 |
| | 2300-3000 | 30, але не менш за 2,15 |
| | Звыш 3000 | 30, але не менш за 2,8 |
| Менш за 5 гадоў | | |
| | Не больш за 1000 уключна | 35, але не менш за 1,2 |
| | 1000-1500 | 35, але не менш за 1,45 |
| | 1500-1800 | 35, але не менш за 1,5 |
| | 1800-2300 | 35, але не менш за 2,15 |
| | 2300-3000 | 35, але не менш за 2,15 |
| | Звыш 3000 | 35, але не менш за 2,8 |
| 5 гадоў і болей | | |
| | Не больш за 1000 уключна | 2,5 |
| | 1000-1500 | 2,7 |
| | 1500-1800 | 2,9 |
| | 1800-2300 | 4,0 |
| | 2300-3000 | 4,0 |
| | Звыш 3000 | 5,8 |

**Стаўкі мытаў для юрыдычных асобаў з 1 студзеня 2010 на аўтамабілі з дызельным рухавіком**

| Узрост машыны | Аб'ём рухавіка, куб см | Стаўка мытаў і падаткаў, у працэнтах ад мытнага кошту, еўра за куб см аб'ёма рухавіка |
|---|---|---|
| Новыя | | |
| | Не больш за 1500 уключна | 30, але не менш за 1,45 |
| | 1500-2500 | 30, але не менш за 1,9 |
| | Больш за 2500 | 30, але не менш за 2,8 |
| Менш за 5 гадоў | | |
| | Не больш за 1500 уключна | 35, але не менш за 1,45 |
| | 1500-2500 | 35, але не менш за 2,15 |
| | Больш за 2500 | 35, але не менш за 2,8 |
| 5 гадоў і болей | | |
| | Не больш за 1500 уключна | 2,7 |
| | 1500-2500 | 4,0 |
| | Больш за 2500 | 5,8 |

**Продажы новых аўтамабіляў у Беларусі ў 2008-2009 г.**

| Марка | Продажы ў студзені-чэрвені 2009 г. | Продажы ў 2008 г. |
|---|---|---|
| Volkswagen | 1467 | 6334 |
| Toyota | 1128 | 2703 |
| Mazda | 454 | 1702 |
| Kia | 220 | 1247 |
| Ford | 436 | 1098 |

### Сідорскі: Можам збіраць «фіяты»

У Беларусі могуць стварацца прадпрыемствы па вытворчасці легкавых аўто, заявіў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі. Як паведамляе БЕЛТА, ён адзначыў, што ўрад вёў перамовы на гэтую тэму з Кітаем, Іранам, таксама паступілі прапановы ад італьянскай кампаніі «Фіят». Прэм'ер адзначыў, што сабраныя ў краіне аўтамабілі змогуць прадавацца на ўсёй тэрыторыі Мытнага саюза.

Пляцоўка для аўтавытворчасці маецца ў Лідзе.




PHOTO BYMEDIA.NET

З Новага года ў аўтасалоны беларусы будуць хадзіць, як у музей.

пейскіх машын з аўтавозаў.

Мытны саюз ударыў не толькі па беларусах, але і па літоўцах. Шмат хто з іх жыў за кошт аўтавозаў і далейшага продажу машын у Расію і Беларусь.

### Беларускія аўтарынкі

Калі ехаць у суседнія краіны няма ні часу, ні жадання, ці розніца ў коштах некалькі тысяч даляраў не здаецца прынцыповай, можна адпраўіцца і на беларускія аўтарынкі. У краіне іх сем: «Малінаўка» і «Ждановічы» ў Мінску, «Бакунінскі» і «Асаўцы» каля Гомеля, а таксама брэсцкі, гродзенскі і віцебскі.

Чым бліжэй да Літвы, тым танней. Лічыцца, што на гродзенскім аўтарынку цэны найніжэйшыя. Праўда, і машыны там менш падрыхтаваныя. Адпаліраваныя да бляску, яны накіроўваюцца ў Мінск, дзе прадстаўлены найбольшы выбар.

### Бязмытныя легкавушкі расійскай зборкі

У той час як мыты на заходнія аўто павялічацца, машыны, сабраныя ў Расіі, будуць увозіцца ў Беларусь наогул без мытаў. Мыты здымаюцца ў тым выпадку, калі прамысловая зборка дасягнула 30% лакалізацыі. На ўсе краіны-ўдзельніцы Мытнага саюза будзе распаўсюджвацца расійскае заканадаўства ў галіне зборачнай вытворчасці, якое на дадзены момант рознае ў кожнай краіне. Паводле меркавання экспертаў, аб'ём зборкі аўто заходніх марак у Расіі не зможа задаволіць патрэбы беларускіх спажыўцоў. Цяпер у Расіі дзейнічае каля дзесятка заводаў, якія ажыццяўляюць зборку аўтамабіляў замежнай вытворчасці.

Ключавое пытанне, ці адпавядаюць аўтамабілі, сабраныя ў Расіі, якасці заходняй ці японскай зборкі? Пытанне амаль рытарычнае. Усерасійскі цэнтр вывучэння грамадскага меркавання правodзіў увесну апытанне па гэтай праблеме. Толькі 6% патрыётаў былі перакананыя, што расійская зборка — найлепшая ў свеце.

Сярод мінусаў расійскіх іншамарак называюць не толькі разгільдзяйскае стаўленне рабочых, кантроль за дзеяннямі якіх слабы. Прынцыповы момант — горшая якасць запчастак. Напрыклад, рамонт першых усеволжскіх Ford Focus II з праблемамі са счапленнем каштаваў 15% ад цаны новай машыны.

Аўтамабіляў расійскай зборкі на беларускіх рынках прадаецца няшмат. Дый цана на іх амаль не розніцца ад цэнаў на арыгінальныя патрыманыя аўто. Розніца не перавышае 2—3%.

**Матэрыялы палос падрыхтавалі**
**Вольга Жарнасек**
**і Ягор Марціновіч**

### Аўтамабіль у крэдыт

Паколькі існуе забарона на выдачу фізічным асобам крэдытаў у валюце, усе грошы выдаюцца толькі ў беларускіх рублях.

Прапаноў ад банкаў хапае, толькі вось працэнты па іх не радуюць.

**«Прыёрбанк»** гатовы выдаць пад набыццё машыны ад $5000 да $35000 у рублёвым эквіваленце на пяць гадоў пад 25% гадавых. Банк крэдытуе не больш за 80% цаны аўто. Машыну можна купіць толькі ў юрыдычнай асобы.

**«Белгазпрамбанк»** дае крэдыт на 80% цаны новага аўтамабіля на 5 гадоў пад 22,5%—23,5%. На патрыманае аўто стаўка 23,5%—24,5%, а тэрмін — чатыры гады.

**«БПС-банк»** — гэта крэдыт на пакупку толькі новага аўто. Умовы — 70% цаны машыны на 3 гады пад 27,5%.

У дакрызісныя часы стаўкі складалі 12—13% гадавых у валюце і 16—18% гадавых у беларускіх рублях.

Калі спецыяльны аўтакрэдыт банк не выдае, можна паспрабаваць узяць спажывецкі.

Часам крэдытныя прапановы робяць аўтацэнтры. **Салон «Атлант-М»**, які прадае «Фальксвагены», выдае грошы пад 20,8% гадавых на сем гадоў. Патрабаванне — афіцыйная праца ў Беларусі і даведка аб даходах.

Большасць аўтацэнтраў супрацоўнічаюць з канкрэтнымі банкамі і проста дапамагаюць афарміць усе патрэбныя дакументы. Напрыклад, **цэнтр «Рэно»** працуе з «Белросбанкам», а **«Таёта»** прапануе выбар між «Франсабанкам», «БТА Банкам» і тым самым «Белросбанкам».

## Расійскія заводы, якія збіраюць заходнія аўто

**1.** Завод канцэрна **FordMotor (Усеволажск)** — FordFocus. 125 тыс. машын за год.

**2. ЗАТ «Аўтатор» (Калінінград)** — KIAMotors, BMW і GeneralMotors. За студзень-лістапад 2008 г. — 101,1 тыс. машын.

**3. ЗАТ «GM-АўтаВАЗ» (Тальяці)** — GeneralMotors (ChevroletNiva і ChevroletViva). 55 тыс. аўто (2007).

**4. ААТ «Аўтафрамас» (Масква)** — Renault Logan. За студзень-лістапад 2008 — 71,8 тыс.

**5. Аўтамабільная кампанія Sollers** — FiatAlbea, Ssang Yong Rexton, Ssang Yong Kyron і Ssang Yong Actyon.

**6. ТАА «ТагАЗ» (Таганрог)** — Hyundai Accent, Hyundai Sonata, Hyundai Santa Fe Classic, Hyundai Elantra XD.

**7. Завод Volkswagen (Калуга)** — WV Passat, Skoda Octavia і Skoda Octavia Tour. Да 2010 магутнасць завода павінна ўзрасці да 150 тыс.

**8. ААА «Аўтамабільная кампанія «Дэрвейс» (Чаркеск)** — Lifan 7160.

**9. ААА «Таёта Мануфэкчурынг Расія» (Шушары пад Санкт-Пецярбургам)** — Toyota Camry. 50 тыс. у год.

**10. Аўтамабільны завод General Motors (Шушары)** — Chevrolet Captiva і Opel Antara. Разлічаны на 40 тыс. аўто ў год, але днямі канвеер быў спынены.

**Цэны на аўтамабілі ў Расіі і Беларусі**

| Мадэль | Цана ў Расіі цяпер | Цана ў Беларусі цяпер | Меркаваная цана ў Беларусі на аўто заходняй зборкі пасля павышэння мытаў |
|---|---|---|---|
| Focus Ambiente бензінавы, 1,4 л 5-дзв. хетчбэк | $17300 | $15600 | $19200 |
| Focus Titanium бензінавы, 1,8 л 5-дзв. хетчбэк | $20800 | $21200 | $25920 |
| Focus ST бензінавы, 2,5 л 5-дзв. хетчбэк | $39700 | $31200 | $38100 |
| BMW X5 xDrive 30i, бензінавы, 3 л | $94800 | $69600 | $87600 |
| Chevrolet NIVA L бензінавы, 1,7 л | $14000 | $11000 | Прадаецца толькі расійскі варыянт |
| RENAULT LOGAN бензінавы, 1,4 л, седан | $10200 | $10600 | $12700 |
| KIA новы Sorento дызельны, 2,2 л | $40600 | $28 600 | $35200 |
| KIA новы Sorento бензінавы, 2,4 л | $31500 | $27 100 | $32900 |
| Toyota Corolla бензінавы, 1,33 л, 4-дзв. седан | $21600 | $16 700 | $20700 |
| Volkswagen Golf Plus бензінавы, 1,4 л | $21500 | $17700 | $21400 |
| Volkswagen Polo бензінавы, 1,2 л | $16100 | $11200 | $13200 |
| Volkswagen Passat бензінавы, 1,6 л | $26280 | $22200 | $26730 |

# А ў вас ёсць «Параноя»?

Гэтак цяпер шмат хто пытаецца ў кнігарнях пра негалосна забаронены раман Віктара Марціновіча. «Параноя» распавядае аб краіне, падобнай да Беларусі, і горадзе, падобным да Мінска. Ёсць там і пра дыктатуру, і пра каханне. Шмат хто знайшоў у кнізе Марціновіча падабенства з оруэлаўскім «1984». З Віктарам Марціновічам гутарыць карэспандэнт «НН».

**«Наша Ніва»: Віктар, як прынялі навіну пра сваю, хай сабе і негалосную, але забарону? Не страшна?**

**Віктар Марціновіч:** Я быў у ад'ездзе, у Эстоніі, калі пачуў пра забарону. І там гэтая навіна проста не пасавала да стылістыкі тамтэйшай прасторы. Потым галоўным зрабілася адчуванне страшэннай супярэчнасці: з аднаго боку, кнігу, вядома, забараняць няма за што. Але, з іншага боку, яе не маглі не забараніць. Проста сыходзячы з логікі сістэмы. Проста таму, што тэкст, дзе на адной старонцы могуць сустрэцца словы «дзяржбяспека», «праслухоўка», «страх» ды «ён» — не могуць не забараніць.

І вось, калі раман трапіў пад забарону, усё быццам стала на свае месцы. Калі пагартаць тэкст — у словаў, здаецца, з'явіліся новыя сэнсы. Таму мне надалі гонар: быць забароненым пісьменнікам у Беларусі 2009 года.




**«НН»: Пра што «Параноя»?**

**ВМ:** Пра каханне ва ўмовах дыктатуры. Галоўны герой сустракае казачную прынцэсу з процьмай грошай, аўто і кватэрай, якая часам дэманструе якісці непадумны, амаль бязмежны, узровень усёдазволенасці. Дзяўчо выяўляецца каханкай кіраўніка дзяржавы. Герой і каханка кіраўніка дзяржавы ствараюць гняздзечка на знятай кватэры ў Заводскім раёне, наіўна мяркуючы, што ўцяклі ад усяго свету. Але насамрэч усе іх пяшчоты і любошчы дэталёва фіксуюцца. Разгортваецца асабістая драма, напісаная мовай пратаколаў гэбэ.

**«НН»: Гэтая краіна, персанажы, месца дзеяння рамана ўсё ж рэальныя ці прыдуманыя?**

**ВМ:** Немагчыма напісаць раман, не прыдумаўшы краіну нанава. У маім рамане Мінск — пазнавальны, але, вядома, гэта мой уяўлены Мінск, Мінск маёй фантазіі.

**«НН»: Мінск — гэта...**

**ВМ:** ...горад-фантазм, горад, дасканала створаны пад картэжы. Горад, па якім, як ракавыя пухліны, раскіданыя месцы пазбаўлення волі і месцы, што папярэднічаюць пазбаўленню волі. Горад, у якім увесь час цёмна (вельмі дарэчы, што раман выйшаў і пачаў чытаццаабмяркоўвацца менавіта ў лістападзе). Горад шалёна прыгожага зімняга неба, замёрзлых калюг ды іржавага савецкага посткансруктывізму. Горад, у якім можна пачуць водгулле выкананага Мураўёвым у Філармоніі фартэпіяннага канцэрта Моцарта. Горад, дзе ў зробленым з цэлафана бары «Духмяны» п'юць піва пярэваратні і тролі. Гэта газета «СБ», што апісвае адпачынак працаўнікоў МГБ, ажно хочацца іх любіць з усяе змогі, якая толькі ёсць.

**«НН»: Але дайце чытачу надзею — у рамане ўсё сканчаецца добра, каханне перамагае праслухоўку?**


SVABODA.ORG

**ВМ:** Як на мяне — у рамане ўсё заканчваецца добра. Трыма абзацамі раней — і скончылася б кепска. Каханне не перамагае праслухоўку — проста таму, што каханне не можа што-кольвек перамагчы. Каханне — кволае пачуццё, яно робіць чалавека лепшым, дабрэйшым, чым ён ёсць, але каханне складае рукі там, дзе ў цела ўбіваецца сталь. Каханне — не пра перамогу. Каханне заўсёды — пра трохі сумную, але салодкую паразу.

**«НН«: Усе ведаюць Марціновіча з «Белгазеты»: ён рэспектабельны, іранічна-цынічны. А тут — Марціновіч з беларускай літаратуры: з чорнай паранояй замест сцяга. Як гэта ў вас спалучылася?**

**ВМ:** У жыцці любога коміка раней ці пазней надыходзіць момант, калі хочацца сесці, выдыхнуць і сказаць: ну, халера, усё, не смешна. Паглядзіце, што здарылася з Зошчанкам, маю на ўвазе ягоную «Аповесць аб розуме». Пісаў свае жарцікі і кепікі і потым, на пэўным этапе, яго «накрыла».

Разумееце, проста сякая-такая колькасць словаў не складалася ў белгазетаўскую рубрыку «Хорошие новости». Нешта надзвычай лірычнае і вельмі балючае назапашвалася, і вось — вылілася. У гэтым, дарэчы, прычына, па якой я пішу прозу, калі мне тужліва. Бо ў газеце ёсць процьма рэчаў, (пра) якія я магу напісаць, калі мне весела.

**«НН»: На якую публіку разлічвае беларус, які піша па-расійску, але пра Беларусь?**

**ВМ:** Насамрэч я вельмі выразна разумею, што трэба пісаць па-беларуску, каб быць паўнавартасным беларускім пісьменнікам. І я ад уласнага комплексу непаўнавартаснасці, недабеларускасці не пазбудуся проста таму, што я — як бы ні намагаўся — ніколі не напішу па-беларуску так, як магу цяпер пісаць па-расійску. Што зробіш: я і мае героі жывуць тут і не хочуць нікуды эміграваць.

**«НН»: У сувязі з забаронай, што будзеце рабіць далей з кнігай?**

**ВМ:** Нічога ўжо зрабіць з кнігай я не магу. Яна жыве сваім жыццём, як любы вялікі аб'ёмам тэкст. Ведаю, што рэакцыяй на забарону тэксту стала тое, што раман нехта адсканаваў і выклаў у сеціўных бібліятэках. Што будзе далей, залежыць ад процьмы фактараў, у тым ліку цэнаў на расійскі газ.

Мая мара — каб мая кніга змяніла нешта ў чытачах і — хто ведае — у гэтай рэчаіснасці, з якой яна перагукаецца. Каб у выніку «перагуканняў» зрабілася менш і тэкст застаўся ілюстрацыяй змрачнаватых часоў, у якіх мы жылі, ды з якіх ужо выйшлі.

**Гутарыў ЛК**

**«Параноя» Марціновіча выйдзе па-беларуску ў ARCHE**

Урыўкі з рамана Віктара Марціновіча «Параноя» будуць надрукаваныя па-беларуску ў наступным нумары ARCHE. Ён выйдзе ў снежні і будзе прысвечаны айчыннай літаратуры, беларускамоўнай і расійскамоўнай.

# Ініцыяцыя Марціновіча

### Забарона — тыповы стан для беларускага незалежнага выдання.

Раман «Параноя» распавядае аб краіне, падобнай да Беларусі, і таму яго немагчыма купіць у кнігарнях.

Раман зняў з продажаў і oz.by — найбуйнейшая беларуская інтэрнэт-кнігарня. Старонка з вокладкай рамана адчыняецца з пазнакай «Продаж гэтага тавару больш не плануецца». Па тэлефоне супрацоўнікі аддзела абслугоўвання oz.by раяць тым, хто хоча заказаць кнігу, «больш не званіць на гэты конт». Да знікнення з продажу кніга знаходзілася на oz.by у спісе бестселераў.

«Параноя» — першы твор мастацкай літаратуры па-расійску, які трапіў у сучаснай Беларусі пад забарону. Дагэтуль у негалосным спісе знаходзіліся «Случайный президент» Паўла Шарамета і Святланы Калінкінай, «Расстрельная команда» Алега Алкаева, «Лукашенко: политическая биография» Аляксандра Фядуты. Нівадзін таваразнаўца ў дзяржаўнай кнігарні не возьме на распаўсюд гэтыя выданні.

Але то палітыка. А тут — твор мастацкай літаратуры. Модны раман моднага аўтара, выдадзены расійскім выдавецтвам. Упершыню расійскамоўны аўтар сутыкнуўся з «суровыми буднями» незалежнай беларускай культуры.

Беларускія кнігі знаходзяцца пад падазрэннем апрыёры. Выдаўцы на ўласных машынах возяць іх па краіне і распаўсюджваюць на сустрэчах з чытачамі — бо гэтыя выданні не пускаюць у кнігарні. А пісьменніку могуць адмовіць у памяшканні для сустрэчы з чытачамі. А незалежную газету не бяруць на продаж у прыватныя крамы без дазволу аддзела ідэалогіі.

Цэнзура нецэнтралізаваная — самая эфектыўная. Чыноўнікі не маюць канкрэтных спісаў. Ёсць агульныя ўяўленні пра тое, як мусіць выглядаць і што ўтрымліваць непажаданая кніга. І хутчэй перастараюцца, чым недастараюцца.

Усё, што ўтрымлівае ў сабе элемент палітыкі, рэпартажу з сучаснага жыцця краіны, недзяржаўнай ініцыятывы і нават гісторыі — тут ці там трапляе пад забарону. Ад дзіцячай кніжкі Уладзіміра Арлова «Адкуль наш род» і да філасофскай працы Пётры Рудкоўскага «Паўстанне Беларусі».

Сёння дзяржава можа нацыснуць нават на інтэрнэт-краму: як паказаў прыклад oz.by. Інтэрнэт-краму лёгка «дастаць» праз рэгістрацыйнае і падатковае заканадаўства. І ўсё ж інтэрнэт, на шчасце, неабдымны і некантраляваны. Пошук тэксту «Параноі» ў сеціве заняў роўна чатыры хвіліны.

**Сяргей Мікулевіч, Алесь Пілецкі**

АЦЭНКА КРЫТЫКА

## Архідэі-інтэлектуалы і жывёлападобны народ

Апісанне жыцця беларускага соцыуму [у рамане Марціновіча] надзвычай схематычнае: краіна, населеная жывёлападобнымі істотамі, пасярод якіх пакутуюць, хаваючыся ў кавярнях і салонах дарагіх машынаў, рэдкія архідэі-інтэлектуалы.

З «Параноі» чытач болей даведваецца пра багаты ўнутраны свет аўтара, ягоную эрудыцыю і здольнасць да вербальнай акрабатыкі, чым пра краіну, у якой жыве. Дыктатар Мураўёў, нягледзячы на сваё ісцінна-рускае прозвішча, прыкульгаў аднекуль з Лацінскай Амэрыкі. З свайго, роднага трэба адзначыць газету «Беларусь сегодня», якую вельмі дасціпна парадзіруе Марціновіч.

**Будзімір, радыё «Свабода»**

# Вольскі запісаў альбом класікі

За той год, што N.R.M. не выступаў у Беларусі, Лявон Вольскі падрыхтаваў альбом на вершы хрэстаматыйных паэтаў: ад Яна Чачота да Рыгора Барадуліна.

**«Наша Ніва»: Лявон, дзе N.R.M.? Не чутно было амаль год...**

**Лявон Вольскі:** 2009-ы мы абвесцілі годам тэсту нашым слухачам. І што высвятляецца? Вельмі мала людзей павесілі на покуці абразы N.R.M. замест прэзідэнта. Ні табе грамадскага (ва)рушэння, ні масавых пратэстаў! Ніхто не выйшаў на вуліцу і не крычаў: «Вярніце нам нашую музыку! Чаму яны не лабаюць!?»

А пра «Мрою» — дык наогул плакаць хочацца: я ўжо сам пра яе забыў. Сёлета на «Басовішчы» гралі ва ўвасабленні «Мроі», дык настолькі ўсё трывала забылася, што я ўласныя песні спяваў як кавер-версіі: наноў вывучыўшы тэксты. А гітарысты вымушаныя былі здымаць ноты з уласных запісаў... Калі мы пачалі выступ, апранутыя пад рокераў 1980-х, ды зайгралі старыя аранжыроўкі, публіка стаяла трохі ачмурэлая: маўляў, што за маскарад? Потым, калі мы пераапрануліся ў нашу энэрмаўскую ўніформу, публіка ўвогуле ў транс увалілася! Граем-граем мы як N.R.M. якіх пятнаццаць хвілін, і тут выходзіць на сцэну вядучы Шалкевіч і абвяшчае: «Усё, хлопцы, канец. Паліцыя кажа, што скончылася арэнда!» Так што суцэльнае забыццё.

**«НН»: Дык N.R.M. больш няма?**

**ЛВ:** Як гэта няма, калі мы граем канцэрт? А калі сур'ёзна, дык гадавая паўза — ненаўмысная, проста ўсе энэрмаўцы па творчых справах з'язджалі за мяжу. Па-другое, не было творчай пільнасці збірацца разам. Ну, не адчувалі мы патрэбы чарговы раз без новага матэрыялу ў ДК рабіць канцэрты! N.R.M. — гэта хутчэй за ўсё праект чатырох самастойных творцаў. З іншага боку, у мяне асабіста за гэты год жыццё змянілася кардынальна, ніколі не было такога плённага перыяду...

**«НН»: Словам, ёсць з чым паказацца публіцы? Ці проста лічыце абавязкам зрабіць канцэрт на 15-годдзе гурта?**

**ЛВ:** Тут ва ўсіх канцэрты: дзесяцігоддзі, дваццацігоддзі... А мы нават не анансавалі, што нам у лістападзе споўнілася пятнаццаць. Бо ў гэтыя светлыя юбілеі прынята дарыць дачы на Канарах, чорныя «Інфініці»... А паколькі нам нічога такога не падорацць, дык мы вырашылі, што юбілею не будзе. Пагатоў 15 гадоў — ніякі не юбілей. N.R.M. ёсць што сказаць, спадзяемся на дыялог, на нязмушаную гутарку з калядным налётам.

**«НН»: Тым больш, цяпер вас не забараняюць…**

**ЛВ:** Так. Тое факт хутчэй пазітыўны, хаця ў адваротных умовах можна было жыць абсалютна нармалёва. Калі нас пярылі як забароненых рэвалюцыянераў. Тады людзі ў Еўропе на нашыя канцэрты прыходзілі, каб паглядзець, што гэта за дзікія музыкі, якіх так жорстка забаранілі на радзіме? У разбэшчаным Берліне, дзе штоноч — дзясяткі розных канцэртаў мы збіралі поўныя клюбы. Потым народ, відаць гаварыў: «Дзіўна. Звычайны рок-канцэрт... Чаму ніхто не страляў, нікога не забілі, нават, не было ніякае палітінфармацыі».

**«НН»: Нашто тады было музыкам да Праляскоўскага хадзіць?**

**ЛВ:** Ня ведаю, якія ў іншых былі мэты, а мне не было зразумела, хто, куды тэлефануе, каб нас забараніць, што ўвогуле гэта за забароны дэбільныя? Хацеў пачуць, што мы афіцыйна забароненыя. Папросту прагнуў, каб былі пастаўленыя кропкі над «і». Альбо крэскі над «ў». Але ў выніку высветлілася, што вецер змяніўся...

**«НН»: Дык як лепей, так ці забароненым?**

**ЛВ:** І так і гэтак. Таму што N.R.M. любы стан падабаецца: і забаронены, і незабаронены. Мы гэта прайшлі, і любую забарону перажывём з набыткам для сябе. Цяпер нават пасыпаліся настойлівыя прапановы нашаму менеджэру зайграць на афіцыйных фэстах. Мы адмаўляемся, бо нелагічна выходзіць: тыя самыя, што цябе ўсімі сіламі забаранялі, цяпер гасцінна рэкамендуюць паўдзельнічаць. Пры ўсім пры гэтым, наколькі мне вядома, на перыферыі дагэтуль ёсць гэтыя «расстрэльныя» спісы, якімі карыстаюцца дырэктаркі мясцовых ДК.




Увогуле, я адмоўна стаўлюся да цвёрдай дзяржлініі ў адносінах да рок-музыкі і любога іншага мастацтва.

**«НН»: Як так: у дзяржавы не павінна быць палітыкі ў дачыненні да музыкі?**

**ЛВ:** Дзяржава і музыка ніяк не павінны перакрыжоўвацца. На прыкладзе айчыннай папсы, падтрыманай дзяржавай, відаць, што нічым добрым гэта не скончаецца. Не верыць народ сваёй папсе. Такая яна штучная. Нават замежны поп: там, прынамсі, імпэт ёсць, энергія, бо яны вольныя і не сядзяць на акладах, на прымусовых размеркаваннях білетаў і раздачы кватэраў.

У нас павінна быць спрыяльнае заканадаўства для шоу-бізнэсу і агульная свабода. А цяперашняе заканадаўства не прадугледжвае, напрыклад, тур якога-кольвек гурта па краіне. У дадатак, трэба, каб нешта змянілася ва ўладзе, і тады шоу-бізнэс расквітнее. Так было паўсюль: у Польшчы, Украіне.

**«НН»: А няма адчування, што вы перараслі культурнае поле Беларусі?**

**ЛВ:** Ну, ну што вы! Гэта нашая краіна, гэта наш слухач, як яго можна перарасці?! Цяпер проста хачу паспрабаваць сябе ў іншых сферах. Вось удзельнічаю ў здымках камедыі паводле майго сцэнару з Алегам Гарбузам, Ганнай Хітрык і Святланай Зелянкоўскай. Так, цяпер я магу дазволіць сабе не ўдзельнічаць у тэлеперадачах, дзе не лічу патрэбным. АНе рабіць нешта для піяру, раскруткі і іншых элемэнтаў гульні ў шоу-бізнэс. Але, калі казаць пра творчасць, дык наш слухач менавіта тут.

**«НН»: І чым яго маеце пацешыць неўзабаве?**

**ЛВ:** Яшчэ да Калядаў мае нарэшце выйсці супольны праект «Такога няма нідзе» — мінімюзікл у стылістыцы 60—70-х. Песні да яго напісаў я, а выконваюць іх разам са мной і самастойна Павел Булатнікаў, Валодзя Пугач, Віталь Артыст, Ганна Хітрык, Руся.

А ўжо бліжэй да вясны будзе сольны праект, з дванаццаці песняў на вершы хрэстаматыйных беларускіх паэтаў: ад Чачота да Барадуліна. Альбом выходзіць стылёва разнастайны: песню на верш Багушэвіча «Немец» зрабілі ў рэпе (у суаўтарстве з Памідоравым). Нечакана для сябе адкрыў вершы Куляшова, Чачота. Там будзе і Максім Танк з вершам «Вецер тваёй Радзімы». Або верш Барадуліна «Белая яблыня грому» — я дагэтуль не магу асягнуць, што там зашыфравана, але нейк душой адчуваецца, што нешта сур'ёзнае.

**Гутарыў ЛК**

БІБЛІЯТЭКА

# Гісторыя без міфаў

Выйшла «Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст.» аўтарства Алега Латышонка і Яўгена Мірановіча.

У прадмове гэтыя беларускія гісторыкі з Польшчы абяцаюць «адстойваць перш за ўсё беларускі ... пункт гледжання на гістарычныя падзеі. Але без празмернага шанавання беларускіх гістарычных міфаў». Такія заявы здольныя выклікаць цікавасць да кнігі.

Польскі варыянт кнігі выйшаў у 2002 г. У беларускім выданніададзена шмат ілюстрацый, а агляд падзей даведзены да 2006 года. Аўтары мяркуюць, што кніга будзе цікавая школьнікам і настаўнікам.

«Яна папулярна напісаная. У добрым сэнсе гэтага слова. Гэта масавае выданне, у адрозненне ад ранейшых беларускамоўных публікацый таго ж Латышонка» ,— кажа гісторык Алесь Пашкевіч, навуковы рэдактар выдання.

Разам з невялікай цаной гэта дае працы Латышонка і Мірановіча вялікія шанцы на папулярнасць.

**Алесь Пілецкі**

**Яўген Мірановіч**

гісторык. У 1980 скончыў філіял Варшаўскага ўніверсітэта ў Беластоку. Доктар гістарычных навук, прафесар. Загадчык кафедры беларускай культуры Беластоцкага ўніверсітэта і рэдактар часопіса Biaioruskie Zeszyty Historyczne. Аўтар «Найноўшай гісторыі Беларусі».

**Алег Латышонак**

гісторык і грамадскі дзеяч. У 1980 скончыў філасофска-гістарычны факультэт Ягелонскага ўніверсітэта ў Кракаве. Доктар гістарычных навук, прафесар. Аўтар больш чым 200 гістарычных артыкулаў. Па-беларуску выйшлі яговыя кнігі «Нацыянальнасць — беларус» і «Жаўнеры БНР».




**«Фальшывая гісторыя — гэта настаўніца фальшывай палітыкі»**

«Мірановіч быў першым незалежным беларускім кандыдатам у польскі Сойм, а Латышонак — лідэрам Беларускага дэмакратычнага аб'яднання, адзінай на той час партыі нацыянальнай меншасці ў Польшчы. Гэтая дзейнасць якраз і вылечыла нас ад рамантычнага погляду на свой народ і ягоную гісторыю. Мы разумеем, следам за вялікім польскім гісторыкам Юзафам Шуйскім, што «фальшывая гісторыя — гэта настаўніца фальшывай палітыкі».

Ці ж трэба для гэтага лепшы доказ, чым параза Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне», які ў свой час пабльтаў Беларусь з Вялікім Княствам Літоўскім?»

**Са «Слова да беларускага чытача», прадмовы аўтараў да беларускага выдання**

**11 снежня (пятніца)** адбудзецца презентацыя «Гісторыі» з удзелам Алега Латышонка **ў мінскай «Гістарычнай майстэрні» (вул. Сухая, 25). Пачатак а 16.00.**

**12 снежня (субота)** кніга з удзелам Алега Латышонка будзе презентаваная **ў Рэчыцы (пачатак а 14.00) і ў Гомелі (вул.Палеская, 52). Пачатак а 17.00.**

**13 снежня (нядзеля)** Латышонак сустрэнецца з чытачамі **ў Магілёве (пачатак а 14.00), у Палацы культуры вобласці**.

**У той самы дзень** Алег Латышонак чакае чытачоў сваіх кніг **у Оршы (пачатак а 18.00)**.

Скончыцца праграма прэзентацый **14 снежня** сустрэчай з чытачамі **ў Наваполацку ў 19.00 (вул. Алімпійская, 2, офіс ТБМ)**.

Усе прэзентацыі адбудуцца ў рамках кампаніі «Будзьма».

# Дзе ўсё ж адбывалася каранацыя Міндоўга?

Піша **Алег Дзярновіч**.

Многія факты, якія падаюцца бясспрэчнымі, не заўжды настолькі відавочныя, як нам падаецца сёння. Вось ужо больш за 430 гадоў працягваюцца спрэчкі пра месца каранацыі караля Міндоўга, заснавальніка дзяржавы, што стала вядомая пазней як Вялікае Княства Літоўскае. У пэўныя перыяды гэтая дыскусія ўспыхвала з новай сілай.

### Хістанні Стрыйкоўскага

Праблема ў тым, што крыніцы XIII ст., сучасныя Міндоўгу — славянскія летапісы, нямецкія хронікі, папскія дакументы, — не ўказваюць такога месца. Не да канца ясным яно ўяўлялася і гістарыёграфам XVI ст. Аўтар першай друкаванай гісторыі ВКЛ, паляк з паходжання і патрыёт Вялікага Княства Мацей Стрыйкоўскі першапачаткова, у 1574 г., у сваёй паэме «Ганец цноты», напісанай па-польску, такім месцам назваў Кернаў:

Потым ахрысціўся, Мендольф званы,
На Літоўскае каралеўства каранаваны,
У Кернаве з дазволу папскага і імператарскага.

Праз два гады Стрыйкоўскі зноў вярнуўся да гэтай версіі ў паэме-хроніцы «Аб пачатках...»:

Не даў сябе Папа доўга прасіць, бо было гэта яму міла,
Што такая вялікая і слаўная дзяржава ахрысцілася.
Ураз карону справіў і ў Рыме асвяціў,
А легатам сваім да Літвы пільна яе несці загадаў.
Так яго з волі папскай укаранавалі
У Кернове і літоўскім каралём абвясцілі.

Кернаў (Кярнава), што знаходзіцца ў Віленскім павеце і размешчаны паўночней літоўскай сталіцы, сапраўды быў значным племянным цэнтрам Аўкштаціі. Той ये часткі, якая, паводле легенды пра Палямона, была названа перасяленцамі з Рыма, продкамі літоўскай шляхты, Лістубаніяй (берагам трубаў), а ў скарочанай версіі — Літвой. У XIII—XIV стст. Кернаў уяўляў сабой сістэму драўляных замкаў і размешчанае побач з імі гарадское паселішча. Даследаванні пахаванняў паказвае, што ў Кернаве таго часу жылі як паганцы, так і хрысціяне — менавіта славянізаваныя крывічы прасунуліся так далёка на Захад. Нямецкія рыцары неаднаразова рабілі напады на Кернаў, пакуль не знішчылі горад у 1390 г., пасля чаго ён ужо ніколі не адрадзіўся ў былой сіле. Не дзіўна, што Стрыйкоўскі прысвяціў столькі ўвагі Кернаву, які часам называюць «першай сталіцай» Міндоўга.

Але ўжо ў новай, галоўнай сваёй працы — «Хроніцы польскай, літоўскай, жамойцкай і ўсёй Русі», якая выйшла з друку ў 1582 г., Стрыйкоўскі змяніў першапачатковую думку ды заявіў, што каранацыя адбылася ў Навагрcraft:

«Так тады Інацэнт, Папа рымскі... бачачы, што такая вялікая і слаўная паганская дзяржава добраахвотна прыступіла да Хрыста, зараз жа без усялякага адкладання асвяціў літоўскую карону і Мендога каралём літоўскім абвесціў, а жадаючы ўсё гэта як мага раней здзейсніць, паслаў легата свайго... Гейндрыха, які, прыехаўшы да Наваградка Літоўскага з арцыбіскупам Рыжскім і з крыжакамі прускімі і лівонскімі, Міндоўга альбо Мендока на каралеўства Літоўскае паводле звыклых цырымоній царкоўных памазаў... і з рук папскіх і імператарскіх каронай новай літоўскай каранаваў».

Сваю працу над «Хронікай...» Стрыйкоўскі пачаў пры двары князёў Слуцкіх-Алелькавічаў, якія сталі ягонымі мецэнатамі. Слуцкі ж двор быў тады багаты на рукапісы, якія не дайшлі да нашых дзён. Магчыма, што выяўленыя тады матэрыялы паўплывалі на ўяўленні гістарыёграфа пра каранацыю Міндоўга ў Наваградку. У любым выпадку за гэтым сцвярджэннем сталі калі не факты з дакументаў альбо прыгадкі ў старажытных летапісах, то, прынамсі, погляды таго магнацкага асяроддзя, у якім Стрыйкоўскі знаходзіў сабе падтрымку.

### Уяўленні XVII стагоддзя

Тое, што існавалі нейкія іншыя звесткі, невядомыя нам, паказвае лацінамоўная «Гісторыя Літвы», створаная Альбертам Віюкам-Каяловічам у 1650—1669 гадах. Гэты гістарыёграф пісаў: «З вялікім ушанаваннем прыняў паслоў [Міндоўга] [Папа] Інацэнт IV, а карону паслаў праз Гейндрыха... Той з арцыбіскупам Рыжскім у полі ў Наваградку (бо ў Наваградку не было такіх вялікіх храмаў) па звыклым абрадзе каранавалі новага караля».

Гэтая дэталь пра поле пад Наваградкам вельмі цікавая і сведчыць, што Віюк-Каяловіч у сваёй працы базаваўся не толькі на паведамленнях Стрыйкоўскага. Хоць вядома, што першая частка кнігі Каяловіча ўтрымлівае пераважна пераказ «Хронікі...» Стрыйкоўскага, з якой гістарыёграф XVII ст. выкінуў самыя фантастычныя звесткі.

«Навагрудскую версію» паўтарае яшчэ адзін помнік XVII ст., Густынскі летапіс: «У тое ж лета вялікі князь літоўскі Міндоўг каранаваны быў на каралеўства Літоўскае ў Наваградку, за блаславеннем Папы Інацэнта...» Крытыкі «навагрудскай версіі» адзначаюць, што Густынскі летапіс — помнік тэндэнцыйны. Ён створаны ва Украіне, і сімпатыі ягоных стваральнікаў — на баку праваслаўя. Таму, маўляў, яны і «выступілі» на баку Наваградка. З іншага боку, Густынскі летапіс часткова базаваўся таксама на крыніцах, невядомых сёння.

### Дыскусіі гісторыкаў

Але ўжо ў канцы XIX ст. погляды гісторыкаў пра месца каранацыі Міндоўга падзяліліся. Частка расійскіх гісторыкаў давярала паведамленням Густынскага летапісу. Польскі ж гісторык Ляткоўскі лічыў Наваградак адным з найважнейшых цэнтраў Міндоўга, але не мог сабе ўявіць там каранацыі, бо ў той год адбыўся паход Данілы Галіцкага ў Панямонне. Але ж той паход быў зімой, бо, паводле летапісаў, яцвягі не змаглі прыйсці на дапамогу Данілу з прычыны вялікага снегу. Каранацыю ж Міндоўга традыцыйна адносяць да лета.

Пасля выхаду ў свет прац Міколы Ермаловіча дыскусіі ўспыхнулі з новай сілай. Падобна, што ўказанне таго ці іншага месца каранацыі Міндоўга дае падставы для рознай інтэрпрэтацыі ранняй гісторыі ўсяго Вялікага Княства. Але ў гэтых дыскусіях часам блытаюцца розныя паняцці: рэзідэнцыя Міндоўга — месца каранацыі — сталіца. Месца каранацыі, як сведчыць еўрапейская гісторыя, зусім не абавязкова павінна супадаць са сталіцай. Дый ці можам у тагачасных умовах мы казаць пра сталіцу ў сучасным сэнсе слова — як месца размяшчэння цэнтральных органаў улады і кіравання?

### Найноўшыя літоўскія версіі

У сучаснай літоўскай гістарыяграфіі пазбягаюць канкрэтызаваць месца каранацыі. Але дзве экзатычныя версіі там з'явіліся. Стваральнік першай, археолаг Урбанавічус, лічыць, што каранацыя адбылася ў Віленскім кафедральным касцёле. Гэта



DESCRIPTIO. Fol. 5.

ces imperio ſuo poſt varios conflictus ſubiecit. Boleſlaum Pudicum Regem Poloniæ 1 2 4 3. anno à Chriſto nato, Danielemq́ Ruſsiæ Monarcham & Regem coronatum 1 2 4 6. ſæpius excurſorijs pugnis, cruenta cum clade Chriſtianorum moleſtauit. Maſouiam, Dobriniam, Kuiauiam, igne ferroq́ multis ſpolijs onuſtus frequenter peragrauit. Poſtea anno Domini 1 2 5 2. á Cruciferis Pruſsiæ, Liuoniæq́ inductus, fidem Chriſtianam cum nonnullis Lituanis & Prutenis ſuſcepit, deditq́ litteras Cruciferis Pruſsiæ ( Magiſtro Henrico de Zalcza in ordine tunc temporis quarto præſidente) quibus aſtruit, & recognoſcit, ſe ab illis multipliciter honoratum & adiutum, & ideo terras ſuæ ditionis, videlicet Samagitarum, Iaczwingoorum, Curowienſium, Weizenſium, & totam terram Lituaniæ perpetua & irreuocabili donatione, ipſis donaſſe & inſcripſiſſe.

версія заснавана на інтэрпрэтацыі вынікаў раскопак на тэрыторыі Ніжняга замка ў Вільні і паведамленняў так званай «Хронікі Рывіуса», складзенай у пачатку XVIII ст. Урбанавічус называе рэшткамі язычніцкага капішча дзве лесвіцы невядомага прызначэння, якія былі знойдзеныя падчас раскопак, і лічыць, што менавіта тут знаходзіўся паганскі алтар, знішчаны Міндоўгам перад сваім хрышчэннем і каранацыяй. А так апісваецца ў «Хроніцы Рывіуса», у якой усё ж не названа, што гэта за месца. Магчыма, выяўленыя пад Віленскай катэдрай археалагічныя аб'екты і можна датаваць XIII ст., хоць многія спецыялісты сумняваюцца ў гэтым. Але прывязка да каранацыі Міндоўга робіцца тут адвольна. Сама ж «Хроніка Рывіуса», як паказалі даследаванні літоўскіх гісторыкаў, была скампіляваная вядомым аматарам містыфікацый Тэадорам Нарбутам. «Віленская версія» застаецца прыўднай.

Найноўшая ж версія належыць Томасу Баранаўскасу і грунтуецца на атаясамленні Летовіі з граматы Міндоўга Нямецкаму ордэну ў 1253 г. («дадзена ў Летовіі...») з гарадзішчам на рацэ Латава на поўначы сучаснай Літоўскай Рэспублікі. Версія гэтая базуецца на падабенстве назваў. Але ж у лацінска-нямецкай транскрыпцыі XIII ст. Літва і называлася Летовіяй. А шлях супастаўленняў назваў старажытных і сучасных вельмі небяспечны. Яшчэ адно: для абгрунтавання сваіх версій Баранаўскас выкарыстоўвае граматы 1260 і 1261 гг., вядомых як сфальсіфікаваныя.

Мы бачым, што літоўская гістарыяграфія ў цэлым скептычна адносіцца да «навагрудскай версіі», але пры гэтым і «віленская версія» каранацыі выглядае вельмі экзатычнай ды не падтрымліваецца большасцю літоўскіх даследчыкаў. У такой сітуацыі многім сур'ёзным гісторыкам з Вільні працей проста ўхіляцца ад вызначэння месца каранацыі.

Заканчваючы агляд, можна адзначыць, што толькі ў XVI ст. былі вызначаны два «прэтэндэнты» на месца каранацыі Міндоўга — Кернаў і Наваградак. Але ў цэлым гістарыяграфічная традыцыя XVI—XVII стст. указвае на Наваградак. Гэтую традыцыю заклаў Мацей Стрыйкоўскі. На што ён абапіраўся — нам не вядома. Але з'яўленне «навагрудскай версіі» наўрад ці можна лічыць проста валюнтарысцкім актам гістарыёграфа XVI ст. у эпоху, калі адбывалася фармаванне шляхты як адзінага палітычнага правамоцнага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага. Наваградак, адзін з найважнейшых цэнтраў перыяду ўзнікнення дзяржавы, стаў сімвалізаваць адзін з ідэалагічных слупоў гэтага палітычнага народа.

# Галубцы, свіныя ножкі і — ох! — рулька

Цікавы рэцэпт галубцоў — з вішнёвым варэннем і цёртай булкай — даведалася ад карэннага мінчаніна Валерыя Бельскага. Паводле ягоных словаў, менавіта такімі ягоная мама ў 1950—1960-х частавала пісьменнікаў — Алеся Адамовіча, Валянціна Тараса, якія прыходзілі да суседа Бельскіх па камунальнай кватэры, літаратара Мікалая Татура. Жылі тады Бельскія ў так званым «доме спецыялістаў», што ў Мінску на праспекце Незалежнасці, 43.

Цікава, што рэцэптаў галубцоў няма ў кнізе Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», якую Караткевіч назваў «першай нашай кухарскай кнігай». А страва ж самая што ні на ёсць беларуская. Не сялянская, канешне, бо складаная і вымагае шмат часу на прыгатаванне. Больш мяшчанская ці нават шляхецкая.

А вось запечаныя свіныя ножкі — страва самая што ні на ёсць сялянская і простая. Але падабаецца і багеме. Рэцэпт паведаміла мне адна з найлепшых перакладчыц беларускай літаратуры ў Польшчы і надзвычайна цікавы чалавек Малгажата Бухалік. Менавіта яна перакладала кнігу Ігара Бабкова «Адам Клакоцкі і яго цені», сёлета вылучаную на прэстыжную польскую літаратурную прэмію Angelus.

Яна прызналася, што любіць свіныя ногі да такой ступені, што, гатуючы, заўсёды з'ядае частку проста адваранымі, бо не мае сілаў цярпець, пакуль яны яшчэ і запякуцца.

А яшчэ пані Малгажата сумуе, што прапалі ў Польшчы свіныя хвасты, а таму немагчыма стала зварыць на памянёных хвастах суп-капусняк. Аказваецца, цяпер ва ўсім Еўрасаюзе хвасты парасятам абразаюць ва ўзросце 2-5 дзён... Бяда! «Мусіць, стану еўраскептыкам!» — кажа перакладчыца. «Тады пераязджайце да нас, — раю я. — У нас хвастоў пакуль хапае».

Стравы са свіных ног — улюбёныя беларускія ўвогуле, і беларускія літаратурныя ў прыватнасці. Засяродзімся на рульцы — гэта тое, што вышэй «свіных ножак», ужо скарыстаных спадарыняй Бухалік.

Дык вось, рулькі свіныя, дзякуючы іх колькасці на свіной тушы ды наяўнасці мяса пад скурай, сталі беларускай нацыянальнай стравай ужо даўно. Паслухайце, што кажа пра іх літаратар Уладзіслаў Ахроменка: «Пры канцы 1920-х жылі ў Гомелі дзве сяброўкі: беларуска Марыя і яўрэйка Сара. Сара была старэйшай сястрой ў шматдзетнай сям'і і заўсёды наракала — як з куркі што гатуеш, дык малыя браты-сёстры спакою не даюць: маўляў, ножку мне, нічога іншага не хачу! А дзе ўзяць на іх усіх, як у куркі толькі дзве нагі? — абуралася Сара.



І вось аднойчы ўвосень прыходзіць Сара ў госці да Марыі і бачыць, як сяброўчыны бацькі разбіраюць кабана. Камсамолка Сара не была рэлігійнай, і таму прыняла запрашэнне пакаштаваць свежаніны. Больш за ўсё яе ўразілі шпігаваныя рулькі, адну з якіх гаспадары перадалі яўрэйскім дзеткам.

— Цяпер ты разумееш, чаму мы свінней гадуем? — запыталася на развітанне Марыя. — Бо ў кабана чатыры нагі, усім хапае!

Марыя — гэта мая бабуля, Марыя Сазонтаўна Раманава, 1908 г. н., ужо нябожчыца. Нашым стравам яна навучылася ад сваёй маці, Вольгі Мінаўны, 1879 г. н., а яўрэйскім намайстрачылася ад той жа сяброўкі Сары, і не толькі ад яе. І мяне ўсяму навучыла...»

І цяпер спадар Ахроменка частуе сваіх шматлікіх сяброў гэтай самай рулькай і чуе толькі захопленыя водгукі!

**Наталка Бабіна**



### Літаратурныя галубцы

*200 мяса без костак, 800 г капусты, 1\3 шклянкі рысу, 2 галоўкі цыбулі, 1 невялікая морква, 1 ст. лыжка цёртых белых сухароў, 1 ст. лыжка таматапюрэ, 2 ст. лыжкі смятаны, 1—2 ст. лыжкі вішнёвага варэння без костачак, соль, перац.*

Мяса пракруціць праз мясарубку, рыс абварыць кіпнем і даць у ім пастаяць, пакуль не астыне вада. Рыс астудзіць, змяшаць з мясным фаршам. 1 галоўку цыбулі здрабніць, прыпусціць да мяккасці на патэльні, дадаць у фарш. Фарш пасаліць, папярчыць, старанна перамяшаць.

Разабраць капусту на лісты, ашпарыць кіпнем і даць пастаяць у гарачай вадзе 5-7 хвілін. Дастаць лісты з вады, астудзіць, раскласці на стале. Калі чаранкі лістоў тоўстыя, зрэзаць іх да таўшчыні ліста. Пакласці ў кожны ліст фарш, закруціць у выглядзе канверта, абсмажыць на патэльні на алеі да залацістага колеру і скласці ў каструлю (лепш у гусятніцу). На патэльні, дзе абсмажваліся галубцы, патаміць папярэдне здрабнёную галоўку цыбулі, цёртую моркву, дадаць цёртыя сухары, тамат, смятану, вішнёвае варэнне, даць пракіпець, разбавіць 1 шклянкай вады, зноў даць пракіпець, пасаліць па смаку і заліць гэтым соусам галубцы. Тушыць на слабым агні пад пакрыўкай або ў духоўцы без пакрыўкі 30—40 хвілін. Падаць у соусе, у якім тушыліся галубцы, можна пасыпаць здробненай зелянінай.

Галубцы можна прыгатаваць без смятаны (калі трэба, каб яны даўжэй захоўваліся), у гэтым выпадку трэба ўзяць трохі больш тамату.

### Свіныя ножкі па-перакладчыцку

*Свіныя ножкі, соль, перац чорны гарошкам, лаўровы ліст, гваздзік, маяран, іншыя спецыі на смак, мёд.*

Узяць свіныя ножкі — чым больш, тым лепш. Адварыць іх на малым агні ў падсоленай вадзе з лаўровым лістам, зярняткамі чорнага перцу, гваздзікам, маяранам і іншымі спецыямі па смаку. У звычайнай каструлі варыць трэба некалькі гадзін, у хуткаварцы — недзе паўтары гадзіны. Ножкі мусяць разварыцца да поўнай мяккасці і зрабіцца клейкімі. Гатовыя ножкі дастаць, астудзіць, можна нацерці мёдам і запячы на працягу кароткага часу ў вельмі гарачай духоўцы да з'яўлення хрумсткай залацістай скарынкі. Мастацтва прыгатавання гэтай стравы палягае ў тым, каб не перасушыць яе і каб пад хрусткай скарынкай ножкі заставаліся мяккімі, ліпкімі і сакавітымі. Падаць з хрэнам.




### Рулька з 1879 года

*1 свіная рулька, часнок, спецыі, карэнні, соль, цыбульнае лупінне, вада.*

Свіную рульку дбайна абскрэбсці нажом. Шчэць, калі ёсць, абсмаліць. Зубчыкі часнаку парэзаць на дзвечатыры часткі кожны, і добра нашпігаваць імі рульку. Часнака не шкадаваць — колькі ў рульку ўлезе, столькі і даваць. Нашпігаваную рульку пакласці ў каструлю, пасаліць, дадаць карэньчыкі са спецыямі і заліць вадой. Дадаць цыбульнага лупіння, бо яно дае вельмі прывабны колер. Праз хвілінаў дваццаць, як вада ў рондалі закіпіць, зліць яе, пакласці рульку на паніву і паставіць у нагрэтую духоўку. Калі на рульцы заззяе залатая скарынка — падаваць на стол з цёртым хрэнам і частаваць гасцей пад поўную чарку.







## КАНЦЭРТЫ

### N.R.M.

**17 снежня а 19-й у к/з «Мінск»** — вялікі акустычны канцэрт N.R.M.

### Канцэрт Віктара Шалкевіча

**11 снежня ў Палацы культуры ветэранаў (вул. Янкі Купалы, 21)** бард Віктар Шалкевіч выступае з праграмай «Лепшае і новае». **Пачатак а 19-й.**

### IQ48 у «Добрых мыслях»

**12 снежня ў Фальварку «Добрыя мыслі» (вул. Магілёўская, 12)** рок-гурт IQ48 сыграе «Самы душэўны канцэрт». Такім чынам музыкі прэзентуюць выхад свайго першага DVD — «Зрабі сам. Акустыка».

### Рок-Каляды-2009

**13 снежня а 15-й у R-Club'е (вул. Сурганава, 26)** — Рок-Каляды-2009. Спецыяльныя госці: **Юры Міхайлаў, Alex Sigmer, 3t.ON, Romantiside, Aillion, «Забыты горад»**.

### Флэшквартэт

**17 снежня а 19-й у Вялікай зале Белдзяржфілармоніі** пачнецца канцэрт з нагоды шведскага нацыянальнага свята Люсіі і заканчэння тэрміну шведскага старшынства ў Еўрапейскім Саюзе. «Флэшквартэт» — легендарны шведскі струнны ансамбль, музычны стыль якога дакладна можна апісаць як «ф'южн», бо ён вар'юецца ад вытанчанага выканання класікі і джазу да эксперыментальнага року.

### «Тузін» на паддашку

Інтэрнэт-партал «Тузін Гітоў» **19 снежня** ладзіць вечарыну з нагоды свайго шасцігоддзя. Бяруць удзел **IQ48, Pomidor/off, Алег Хаменка** з гурта «Палац», гурт Jenowa і праект удзельнікаў гурта «Глюкі» — Akute. Упершыню «тузіноўская» імпрэза пройдзе ў Віцебску, **у клубе «Чердачок». Пачатак а 20-й.**

## ІМПРЭЗЫ

### Алег Латышонак прэзентуе

Прэзентацыі новай кнігі Алега Латышонка і Яўгена Мірановіча «Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVII да пачатку XXI ст.» адбудуцца **ў шэрагу гарадоў Беларусі ад 12 да 14 снежня**. **12 снежня ў Гомелі** прэзентацыя з удзелам Алега Латышонка плануецца **а 18-й па адрасе: вул. Палеская, 52**. **13 снежня** Алег Латышонак сустрэнецца з чытачамі **ў Магілёве ў Палацы культуры (пр. Пушкіна, 7)**. **Пачатак а 14-й.**

### Прэзентацыя электроннага «Збору Храптовічаў»

**9 снежня а 17-й у галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі (пр.Незалежнасці, 116, 3 паверх)** адбудзецца прэзентацыя электроннага выдання «Кніжны збор роду Храптовічаў». Бібліятэка графаў Іаахіма Літавора і Адама Храптовічаў, славутых ваенных і дзяржаўных дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, збіралася на працягу XVIII—XIX стст. і налічвае зараз больш за 2000 экзэмпляраў кніг. Зараз яна захоўваецца ва Украіне. Праект віртуальнай рэканструкцыі збору здзейсніўся дзякуючы супрацоўніцтву Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкі Украіны пры падтрымцы ЮНЕСКА.

### Вершаспеў «Дівчина з легенди»

Вечарына ўкраінскай паэзіі пройдзе **11 снежня ў бібліятэцы імя Цёткі (вул. Талбухіна, 12а)**. Гэта будзе кампазіцыя паводле рамана ў вершах «Маруся Чурай» украінскай паэткі Ліны Кастэнка. **Пачатак у 18.30.**

## СПОРТ

### Хакей

У рамках рэгулярнага першынства КХЛ у Мінску пройдуць два матчы: **9 снежня** — «Дынама» (Мінск) — «Нафтахімік» (Ніжнекамск); **11 снежня** — «Дынама (Мінск) — «Ак Барс» (Казань). Матчы пройдуць **а 19-й у Палацы спорту**.

## ВЫСТАВЫ

### «Усё лятуць і лятуць тыя коні…»

**11 снежня а 18-й у бібліятэцы імя Пушкіна (вул.Гікала, 1)** адкрыецца фотавыстава, прымеркаваная да 1000-годдзя Літвы «Усё лятуць і лятуць тыя коні…».

### У аб'ектыве — случчане

**У Доме-музеі I з'езда РСДРП (пр.Незалежнасці, 31а)** працуе выстава фотаздымкаў Ларысы Салодкінай «У аб'ектыве — случчане».

### Дзень адкрытых дзвярэй у Музеі народнага мастацтва

**12 снежня Музей беларускага народнага мастацтва ў Раўбічах** праводзіць Дзень адкрытых дзвярэй з нагоды свайго 30-годдзя.

### У пошуках Атлантыды. Опса

**У галерэі «Вільня» (вул. Каліноўскага, 55) да 14 снежня** працуе выстава «У пошуках Атлантыды. Опса», зладжаная па выніках пленэру, які праходзіў у вёсцы Опса Браслаўскага раёна. Мэта пленэру — пошук і падтрымка маладых мастакоў.

### Галадамор

**У Гістарычнай майстэрні (вул. Сухая, 25) у Мінску** працуе фотавыстава «Пакараныя голадам: невядомы генацыд украінцаў 1932—1933», прымеркаваная да Дня памяці ахвяраў Галадамора.

### Фота 1969—2009

Фотавыстава Ігара Барсукова «Фатаграфіі 1969—2009 гадоў» працуе **да 20 снежня ў галерэі «Мір Фота» (вул.Прытыцкага, 10)**.

## ТЭАТРЫ

**10 снежня**

**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з дурнем»
**Тэатр юнага гледача** — «Бліндаж»

**11 снежня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дарога на Віфлеем»
**Тэатр оперы і балета** — «Сельскі гонар»
**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Купалаўскі тэатр** — «С.В.»

**12 снежня**

**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»
**Тэатр імя Горкага** — «Ад'ютант-Ша Яго Вялікасці»

**13 снежня**

**Тэатр оперы і балета** — «Чароўная флейта»
**Тэатр юнага гледача** — «Шчаўкунок»
**Купалаўскі тэатр** — «ГендэльБах»
**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»

**14 снежня**

**Купалаўскі тэатр** (малая сцэна) — «Дзікае паляванне караля Стаха»
**Купалаўскі тэатр** — «Я не пакіну цябе»

**15 снежня**

**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Калі скончыцца вайна»
**Купалаўскі тэатр** — «Арт»

**16 снежня**

**Купалаўскі тэатр** — «Сымон-музыка»
**Тэатр імя Горкага** — «Бег»
**Тэатр оперы і балета** — «Алека»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Хто пакахае мадам?»

**17 снежня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Вяртанне галадара»
**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»

**18 снежня**

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармэн»

**19 снежня**

**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр оперы і балета** — «Кармэн»
**Тэатр імя Горкага** — «На залатым возеры»

**20 снежня**

**Тэатр оперы і балета** — «Церам-церамок»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Воўк-мараплавец»
**Тэатр юнага гледача** — «Дзюймовачка»
**Тэатр імя Горгкага** — «Васа»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»

## КІНО

# Камедыя натужлівых усмешак




**Так сабе канікулы** (Old Dogs)
ЗША, 2009, каляровы, 88 хв.
**Рэжысёр:** Уолт Бекер
**Жанр:** Камедыя
**Адзнака:** 4,5 (з 10)

Жывуць сабе два бізнэсоўцы-працаголікі. Раптам аказваецца, што ў аднаго з іх ёсць дзеці. Ён іх ніколі не бачыў. Новаспечаны бацька мусіць пабыць з імі хоць два тыдні. Але ж тут наклёўваецца выгадны кантракт…

Карціна пра «Старых сабак», якая чамусьці перакладзена як «Канікулы» — камедыя натужлівых гэгаў на паўтары гадзіны. Прыціснутыя дзверцамі машыны пальцы, падпалены скаўцкі лагер (навязліва называны «піянерскім»), офісныя звычкі, недарэчныя ў дзіцячай кампаніі, і механічна-электрычныя ўсмешкі.

Усё гэта з поспехам маглі б разыграць манекены. Але ў фільме акторы — Робін Уільямс і Джон Траволта. Гэта трохі ратуе, хоць акторы выглядаюць мітусліва-пляската, без аганьку.

Бачна, што рэжысёру блізкая тэма старых гарэзаў (але не блізкія мудрасць і талент). Плюс — у фільме адсутнічае папулярны клазетны гумар (затое пад завязку «блакітных» жартаў).

Нягледзячы на далёка не геніяльная якасці, камедыя здольная выклікаць рогат у публіцы. А на беларускіх кінасайтах амаль не мае адмоўных водгукаў.

**Андрэй Расінскі**

# Польскія sztuki і штучкі

Золата, срэбра, парцаляна, шаўковыя абрусы, аўтарскія цацкі і бурштын, бурштын, бурштын… У ДК Прафсаюзаў (пр.Незалежнасці, 25) ідзе шыкоўная выстава польскіх ювелірных вырабаў і твораў польскага прамысловага дызайну.

«У Польшчы цяпер ювеліры намагаюцца разбурыць міф пра бурштын як пра ўпрыгожанне для немаладых, — кажа Караліна Брэслер, прадстаўніца Польскага агенцтва інфармацыі і замежных інвестыцыяў, аднаго з арганізатараў выставы. — З гэтым каменем працуюць 20—30-гадовыя майстры, што адбіваецца на выніку: новы падыход, новыя ідэі. Яны спрабуюць спалучаць бурштын з сучаснымі формамі срэбнай і драўлянай ювеліркі, даводзяць вялікія здольнасці гэтага адметнага для нашай часткі Еўропы каменя».

Адным з арганізатараў выставы выступіла галерэя мастацтваў горада Легніца. Яна спецыялізуецца на ювелірных творах, найперш з срэбра. Справа ў тым, што Легніца, якая знаходзіцца на скрыжаванні польскай, чэшскай і нямецкай рамесных традыцыяў, — цэнтр срэбраапрацоўкі. Тут ладзіцца і вялікі штогадовы фэст срэбра.

Выстава мае і прыкладное значэнне: арганізатары не хаваюць, што іх мэта — папулярызацыя цэтліка «Зроблена ў Польшчы». Каб пра польскія ювелірныя і дызайнерскія працы, а таксама пра творы побытавага дызайну даведаліся і ў нашай краіне. Можа, экспанаты і нельга набыць на самой выставе, але большая іх частка — у масавай вытворчасці ды іх можна прыдбаць праз сеціва.

Выстава Designed in Poland («Распрацавана ў Польшчы») працягнецца да 11 снежня. Часы працы: 11.00—19.00.

**ЛК, АП**



**Алімпія Аякаіе. Прамысловы дызайн.**



**Ева Рудоўска. Аздобы з бурштыну.**

# Гульні для чужых

**Якія камп'ютарныя забаўкі распрацоўваюць беларускія кампаніі?**

Камп'ютарныя гульні — не толькі забаўка для падлеткаў. Гэта і паказчык тэхнічнага развіцця краіны. Надзвычай складаны тып праграм — сведчанне высокага ўзроўню камп'ютарызацыі.

А гістарычныя гульні маюць істотны ідэалагічны складнік. Калі большасць праграм распрацоўвалася на Захадзе, амаль кожны бандыт у іх аказваўся «благім хлопцам з Расіі». А ў расійскіх гульнях падлеткам прапануецца дапамагчы непераможнай расійскай арміі паставіць на калені Еўропу.

### Другая сусветная — наша ўсё

У Беларусі больш за два дзесяткі кампаній, якія спецыялізуюцца на стварэнні гульняў. Большасць распрацоўвае «казуальныя» праграмы, разабрацца ў якіх нескладана і школьніку, і хатняй гаспадыні.

Найбуйнейшая кампанія — «Геймстрым» — спецыялізуецца на больш складаных праектах. Яна працуе ў рамках Парка высокіх тэхналогій і ўжо выйшла на міжнародны ўзровень, заключаючы дамовы то з расійскімі, то з японскімі калегамі.

Самая вядомая беларуская гульня — «Аперацыя «Баграціён», якая была прызнаная найлепшай камп'ютарнай стратэгіяй на постсавецкай прасторы ў 2008 годзе. Мiнiстэрства адукацыі нават рэкамендавала выкарыстоўваць яе на ўроках. Ухваліла і Адміністрацыя прэзідэнта. Праўда, чыноўнікі не ўлічылі, што ў гульні можна ваяваць і за немцаў... І з тым жа поспехам перамагчы.

### Малпы, мядзведзі і ўсе-ўсе-ўсе

Ёсць у Беларусі кампанія, Steel Monkeys («Стальныя малпы») — стваральнік гоначных гульняў і «стралялак». Беларусы прыклалі руку і да папулярнага цыклу офісных гульняў Moorhuhn. У айчыннай частцы гульні курыца спаборнічае з астатнімі героямі ў гонках. Галоўны ж праект Steel Monkeys — крымінальная драма з жыцця Лас-Вегаса. Яна ствараецца пяты год.



**Самая вядомая беларуская гульня — аперацыя «Баграціён».**

Беларуская кампанія Aliasworlds распрацоўвала серыю гульняў пра прыгоды медзведзяняці Сняжка. Ёсць і фірмы, якія распрацоўваюць гульні для мабільнікаў. Толькі вось увагі да беларушчыны і ў іх не назіраецца.

### Мэтавая аўдыторыя не тут

Дырэктар «Геймстрыма» Іван Міхневіч заўважае: «Мэтавая аўдыторыя нашых гульняў знаходзіцца ў заходніх краінах, таму прадукты будуць выходзіць па-англійску». Паколькі беларускі рынак невялікі, гульні, якія распрацоўваюцца ў нашай краіне, выдаюцца пераважна ў Расіі. А паколькі замежнікам не надта цікавая беларуская гісторыя, і камп'ютарных гульняў па яе матывах мала. Выключэнне стварае хіба Другая сусветная вайна.

**Ягор Марціновіч**

# Усе з SADу

**Наступіла пара года, калі ад раніцы трэба паліць святло ў хаце. З паўдня — цямнее. Настрою ніякага няма. Псіхолагі завуць гэта сезонным эмацыйным разладам (SAD). Як яго перамагаць?**

Паводле статыстыкі, да гэтай хваробы схільныя 6% амерыканцаў, 8% канадцаў, 10% брытанцаў і 20% жыхароў скандынаўскіх краін, піша Wall Street Journal. Чым далей ад экватара, тым больш людзей пакутуюць на SAD.

Беларусь не выключэнне — паглядзіце на твары пасажыраў у метро раніцай. Людзі ўжо стомленыя, а дзень і пачацца не паспеў. Сімптомы: дэпрэсія, млявасць, раздражняльнасць. Калі ў вас рэзка падвысіўся апетыт і вы прагнеце вугляводных прадуктаў, гэта таксама адна з прыкметаў SAD.

Выклікае SAD, найхутчэй, памяншэнне светлавога часу сутак увосень і ўзімку. Скарачэнне дня парушае біялагічныя гадзіны, якія адказваюць за адчуванне часу. Або цемра руйнуе працэсы ў мозгу, якія адказваюць за настрой. А меншая колькасць сонечных промняў абвастрае недахоп вітаміна D.

Але гэтыя тэорыі не тлумачаць, чаму пік сімптомаў назіраецца ў студзені і лютым, калі дзень ужо расце. Ці чаму SAD больш моцна праяўляецца ва ўзросце ад 18 да 30 гадоў, ці чаму жанчыны пакутуюць ад яго ўтрая часцей за мужчынаў. Пры гэтым, да прыкладу, сярод насельніцтва Ісландыі гэтага захворвання амаль няма.

Самае папулярнае лячэнне — святлотэрапія. Трэба пасядзець перад яркай лямпай 15—20 хвілін у дзень, раяць навукоўцы з Калумбійскага ўніверсітэта (ЗША). Гэта дапамагае пазбавіцца 80% сімптомаў. Вынікі маюць быць праз тры дні, хоць лячэнне варта працягваць мінімум тры тыдні.

Антыдэпрэсанты. Калі святло не дапамагае, можна паспрабаваць пігулкі. Але ўсё ж святлолячэнне нясе ў сабе менш пабочных эфектаў.

Вітамін D. Ён выпрацоўваецца арганізмам падчас уздзеяння на скуру сонечных прамянёў, узімку яго колькасць рэзка памяншаецца. Загар у салярыі дапамагае арганізму выпрацоўваць вітамін D і падняць настрой за кошт стымуляцыі эндарфінаў. Аднак такі загар нясе сур'ёзную рызыку — рака скуры, пашкоджанняў сятчаткі вачэй, ранняга старэння.

Практыкаванні на свежым паветры. Для тых, у каго няма часу бегаць уранку, можна замяніць паездку на працу шпацырам да офіса пешкі. Яшчэ адзін варыянт — дыета з адмовай ад спажывання вугляводных прадуктаў. Больш гароднiны і лёгкая ежа дапамогуць наладзіць выкіды інсуліну, што таксама паляпшае настрой.

Калі гэтыя варыянты для вас занадта простыя, заўсёды можна паспрабаваць тэхналагічныя навінкі.

Сімулятары світанку. Светлавы будзільнік стварае павольнае світанне ў вашым пакоі. Паступова святло становіцца ярчэйшым і падрыхтоўвае арганізм да абуджэння. Пасля такога будзільніка ўставаць прасцей і прыемней. Іянізатары. Пасля навальніцы паветра зараджанае малекуламі кіслароду з дадатковымі электронамі ці адмоўнымі іонамі, якія станоўча ўплываюць на настрой. На рынку ёсць некалькі мадэлей генератараў іонаў. Некаторыя выглядаюць як бранзалеты, іх можна насіць на руцэ. Іншыя — паставіць ў пакойчыку і яны перыядычна будуць выкідаць у паветра іоны, якія палепшаць атмасферу, напрыклад, на працы.

**Настасся Шамрэй**

# Фрукт памерам з мяч

**Памэла — абсалютна натуральны і карысны плод.**

Калі вы пабачыце на прылаўках апельсін памерам з футбольны мячык — не палохайцеся. Гэта не вынік генетычных мадыфікацый. А абсалютна натуральны і карысны фрукт — памэла.

Памэла паходзіць з паўднёва-ўсходняй Азіі, Малайзіі, астравоў Танга і Фіджы. Ён быў вядомы ў Кітаі ажно з 100-га г. да нашай эры. Была версія, што памэла — вынік мутацыі апельсіна ці грэйпфрута. Але ўсё наадварот: па меркаванню спецыялістаў цытрусавай генетыкі, гэта грэйпфрут — нашчадак памэла. Вага плода можа дасягаць 10 кілаграмаў, дыяметр — 30 см.

Агулам памэла выйграе у грэйпфрута — ён не горкі, яго прасцей чысціць, ім складаней запэцкацца. Яшчэ адно адрозненне: скурку ў грэйпфрута нельга есці.

Выбраць смачны салодкі памэла нялёгка. Трэбна звярнуць увагу на скурку: яна павінна быць гладкай, бліскучай, але трошкі мяккай навобмацак. Не саромейцеся панюхаць фрукт: чым больш ён духмяны, тым будзе смачнейшы. Час выспявання памэла — месяц люты. Аднак на нашых прылаўках ён з'яўляецца ўжо ў снежні. Будзьце ўважлівыя: памэла белага ці чырвонага колеру з зялёнымі плямамі можа аказацца недаспелым.

Свежы непачышчаны памэла можа захоўваца пры пакаёвай тэмпературы цэлы месяц. А пачышчаны ў лядоўні — не болей за тры дні.

Памэла — гэта крыніца аскарбінавай кіслаты, вітаміна А, эфірных алеяў, антыаксідантаў, мікраэлементаў. Дзякуючы вітаміну С і эфірным алеям, памэла памагае барацьбе з вірусными захворваннямі. Ліпалітычны фермент паскарае расшчапленне бялкоў, таму памэла выкарыстоўваюць у розных дыетах. Антыаксіданты, якія ёсць ў памэла, супрацьстаяць з'яўленню ракавых захворванняў.

Еще з карысцю для свайго здароўя!

**НШ**

НАША СТРАВА

## Капуста посная, добрая

**2—3 галоўкі капусты, 2—3 шклянкі буракавага расолу, 0,5 шклянкі парашку з сухіх грыбоў, 2—4 кавалкі цукру, 1—2 лыжкі масла, 1 шклянка смятаны, 0,25 шклянкі мукі, соль і перац па смаку.**

Нашынкаваць капусту, адварыць, адціснуць, змясціць у гарнец, заліць буракавым расолам, пасаліць, варыць да мяккасці. Пакаштаваць. Калі акажацца залішне кіслай — дадаць гарачай вады. Калі капуста будзе гатовая, дадаць масла, смятану, цукар, грыбны парашок, муку. Добра перамяшаць і некалькі гадзін тушыць на малым агні, пастаянна памешваючы, каб не падгарэла. Перад падачай на стол пасыпаць молатым перцам.

## Буракова расол да капусты посная, добрай

**0,5 кг буракоў, 3 л вады, 1 ст. лыжка цукру, некалькі скібачак чорнага хлеба**

Буракі вымыць, абраць, дробна парэзаць і скласці ў трохлітровы слоік. Заліць 2,5 л кіпеня, дадаць хлеб і цукар, абвязаць марляй і пакінуць, каб хадзілі, на 4—5 сутак. У гэты час на паверхні расолу будзе збірацца шум, яго трэба 1—2 разы на дзень здымаць. Калі шум перастане збірацца, расол працадзіць праз марлю, пераліць у чысты слоік і захоўваць у халодным месцы.

З кнігі: Вінцэнта Завадская «Кухарка літоўская», 1858

**Рэцэпты тыдня падрыхтавала і праверыла — пальчыкі аблізала — Наталка Бабіна**

ГАЗЕТКА ДЗЕТКАМ

Прынясіце ліст паперы,
Што вышэй за нашы дзверы,
Што шырэй за нашу шафу,
Намалюю вам жырафу.

Больш дзіцячага па-беларуску на dzietki.org


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ВІТАННІ

**Даражэнькая матуля,** з Днём народзінаў! Хай усе зорачкі свету ззяюць у тваім акенцы і тваёй душы. Яраслава і ўсе-ўсе-ўсе!!!

**Маладафронтаўцы віншуюць Івана Шылу** з вызваленнем!!! Спадзяемся, што больш ты нас не пакінеш!!! Жыве Беларусь!

**Віншуем любых маму Наташу і тату Дзіму** з 21-й гадавінай вяселля! Шчаслівыя дзеткі.

ЖЫТЛО

**Здыму 2-пакаёвую кватэру ў Мінску.** Пажадана недалёка ад Інстытута культуры (але разглядаюцца ўсе варыянты). Своечасовая аплата і парадак гарантаваны. Да 250$. Т.: (044) 488-02-32.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!






ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Мінску прайшоў чэмпіянат цырульніцкага майстэрства «Стыль і харaство». Спаборнічалі ў мастацтве прычоскі, макіяжу і бодзі-арту.**




PHOTO.BYMEDIA.NET

**Пост у разгары. Продаж рыбы на Прывакзальнай плошчы.**

**Так размяшчаліся кнігі, выдадзеныя праўладным саюзам пісьменнікаў, на выставе падчас устаноўчага з'езда «саюза пісьменнікаў саюзнай дзяржавы», што прайшоў у Мінску 4 снежня. Уверсе — кнігі Мікалая Чаргінца і пра Мікалая Чаргінца. Пад ім менш вядомыя пісьменнікі — Купала, Колас і інш.**




БЕЛАПАН



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У Мінску прайшоў кацiны з'езд: выстава «Найлепшы кот — 2009».**



REUTERS

**У Венецыі ў пачатку снежня — *acqua alta*, высокая вада. Прылівы ў Адрыятыцы ўзмацняюцца вятрамі сірока і борай і наганяюць ваду ў венецыянскую лагуну. Яе ўзровень дасягае сёлета 131 см, 70% горада затоплена. А люд не бядуе.**




## АНЕКДОТЫ

Як змагацца з карупцыяй у краіне, дзе канверты зробленыя па шырыні купюр?

* * *

— Ёсць у нас на заводзе такая прыкмета: калі начальнік цэха крычыць, значыць, зноў не трактар сабралі...

— А што тады сабралі?

— А вось што крычыць — тое і сабралі...

* * *

— Васіль, ты ведаеш сваё генеалагічнае дрэва?

— Ведаю — дуб.

— Ясна, расці далей.

* * *

Пажарныя выязджаюць, каб адмачыць там, дзе нехта адпаліў.

* * *

Янка на вяселлі аднакурсніка штурхнуў сваю сяброўку, каб яна не злавіла букет...

* * *

Прыходзіць свіння ў фармакалагічную кампанію і пытаецца:

— Скажыце, дзе я магу атрымаць сваю долю?

## НН 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Краснае Вілейскага пав.** Зладзеі нядаўна ўбіліся ў краму і пачалі там парадкаваць. За сцяной спаў гаспадар — Плотнік; прачнуўшыся, нарабіў ён гвалту і зладзеяў прагнаў. Тады яны паехалі да другога жыда, што дзяржыць рэстаран; выкацілі пачатую бочку з селядцамі; жыд, прачнуўшыся, давай іх даганяць; зладзеі скінулі на ўцеху гаспадару з воза 16 селядцоў, а з рэштай уцяклі.

**«НН». №49. 1909**

**Замест палітыкі — дысідэнцтва.** Падпісанне дамовы аб утварэнні саюза з Расіяй у Мінску адзначылі стыхійнымі пратэстамі. 75 чалавек зранку ў сераду адгукнуліся, перакрыўшы праспект Скарыны жывым ланцугом, трымаючы лозунгі «Рукі прэч ад Беларусі!», «Не — саюзу». Прастаяць атрымалася хвілінаў 10, пасля чаго пад'ехала міліцыя ды адцясніла пратэстантаў. Тым не менш, людзі прызначылі працяг акцыі на пятую вечара.

Працяг акцыі быў у значнай меры сарваны з-за затрымання намесніка старшыні БНФ Вячаслава Сіўчыка. Тым не менш, у 17.25 праспект зноў перакрылі, але менш чым на паўхвіліны.

Шкада толькі, што палітыкі, замест таго, каб зладзіць буйную акцыю, дамовіўшыся папярэдне, прабіўшыся ў газеты і раскідаўшы ў горадзе ўлёткі, ахвяруюць сабой на акцыях адчаю.

**«НН». №34. 1999**

**Наша Ніва**

незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф-рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| заснавальнік | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

©**НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фармата́м А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15-128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

Наклад 6180. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 08.12.2009.
Замова № 6738.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15-128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614